БУДНІ КАЛОНІІ ДЛЯ НЕПАЎНАЛЕТНІХ 3

КАЛІ ЧАКАЦЬ ГРЫП? 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

27 ЛІСТАПАДА 2019 г. СЕРАДА

№ 225 (29092)

ЗВЯЗДА

Бяспека — міжнародная, рэгіянальная, інфармацыйная

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 27—28 лістапада наведае з рабочым візітам Кыргызстан, дзе возьме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Аб гэтым паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Сёння пройдзе сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Плануецца абмеркаваць каля 20 пытанняў, большасць з якіх будзе вынесена на сесію Савета калектыўнай бяспекі.

Афіцыйны сайт арганізацыі паведамляе, што шэраг пытанняў парадку дня, у прыватнасці, звязаных з праблемамі міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і сітуацыяй у зоне адказнасці АДКБ, члены Савета калектыўнай бяспекі абмяркуюць у вузкім складзе (кіраўнікі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана). Пасля гэтага пройдзе пленарнае пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі, дзе да лідараў дзяржаў далучацца міністры замежных спраў, міністры абароны і сакратары саветаў бяспекі дзяржаў — членаў АДКБ.

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на саміце абазначыць пазіцыю і асноўныя прапановы беларускага боку па развіцці і ўмацаванні міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі ў розных яе сегментах. Традыцыйна на палях саміту кіраўнік беларускай дзяржавы правядзе сустрэчы і перагаворы з замежнымі калегамі.

На парадку дня сесіі — абмеркаванне праблем міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, пытанні ўмацавання таджыкска-афганскай мяжы, узаемадзеянне з ААН па рэалізацыі Глабальнай контртэрарыстычнай стратэгіі і каардынацыя знешнепалітычнай дзейнасці дзяржаў — членаў АДКБ, развіццё ваеннага патэнцыялу арганізацыі і ўдасканаленне механізмаў супрацьдзеяння выклікам і пагрозам, у тым ліку ў сферы інфармацыйнай бяспекі, а таксама мерапрыемствы па святкаванні 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Усяго ў парадак дня пасяджэння Савета калектыўнай бяспекі АДКБ уключана 17 пытанняў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ГАЛОЎНЫ ЭКЗАМЕН — НАПЕРАДЗЕ

Прэзідэнт уручыў узнагароды спартсменам і трэнерам нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ.

Медаль «За працоўныя заслугі» атрымаў трэнер-выкладчык філіяла Гомельскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву Міхаіл АЗЁМША, старшыя трэнеры нацыянальнай зборнай Мікалай БАНЬКО і Генадзь ГАЛІЦКІ. Гэтай узнагароды ўдастоены таксама спартсмены-інструктары нацыянальнай каманды Марына ЛІТВІНЧУК і Вольга ХУДЗЕНКА. Ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоена спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Арцёму КОЗЫРУ.

Нацыянальную зборную па веславанні на байдарках і каноэ кіраўнік краіны назваў самай стабільнай і паспяховай у дзесяцігоддзі, а іх від спорту — праўдзіва беларускім, бо яго традыцыі непарыўна звязаны са шматвяковай культурай і побытам Беларусі, краю тысячы рэк і азёр.

Беларускія балельшчыкі даўно прызвычаіліся да перамог байдарачнікаў і канаістаў на самых буйных міжнародных спаборніцтвах. З кожнага турніру, у тым ліку з Алімпійскіх гульняў, яны вяртаюцца з медалямі.

«У чэрвені падчас II Еўрапейскіх гульняў я з вялікім задавальненнем гэта назіраў. Я ўважліва сачыў за гарачымі жнівеньскімі баталіямі на чэмпіянаце свету ў венгерскім Сегедзе, дзе вы даказалі, што беларусам сёння няма роўных у свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Бадай, самы значны доказ гэтым словам і асаблівая падстава для ўшанавання — чатыры залатыя, два сярэбраныя і два бронзавыя медалі Марыны Літвінчук і Вольгі Худзенкі, золата Арцёма Козыра на II Еўрапейскіх гульнях. Усяго па выніках спаборніцтва беларускія байдарачнікі і канаісты заваявалі дзесяць узнагарод. Пераможную серыю спартсмены працягнулі і на чэмпіянаце свету ў венгерскім Сегедзе, дзе зборная ўзяла 14 медалёў, шэсць з якіх — залатыя. Спартсмены перамаглі ў камандным заліку і пакінулі ззаду іншых лідараў сусветнага веславання — зборныя Германіі, Венгрыі, Кітая, Расіі, Новай Зеландыі. СТАР. 2

Дзе «прачынаюцца» робаты?

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

У Краснапольскай гімназіі ўжо некалькі гадоў працуе гурток, куды кожны ахвотны можа прыйсці і навучыцца рабіць і праграмаваць робатаў. Старэйшыя вучні з задавальненнем перадаюць свае веды малодшым школьнікам.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯРАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»:

«У цяперашні час ужо 17 рэзідэнтаў парка пачынаюць ажыццяўляць сваю гаспадарчую дзейнасць (шэсць з іх актыўна выпускаюць прадукцыю ў галіне машынабудавання, электронікі). Да канца бягучага года такіх прадпрыемстваў будзе не менш за 20, а ў 2020 годзе іх павінна быць 30».

Фінансавая палітыка

Крокі да ўстойлівасці

Запаволенне інфляцыі не прывядзе да абмежавання эканамічнага росту

Эксперты адзначылі, што інфляцыйныя чаканні наўпрост залежаць ад рэальных інфляцыйных усплёскаў на рынку. Перад пачаткам семінара «Палітыка для росту», які праводзіўся ў Нацыянальным банку, намеснік старшыні праўлення гэтага ведамства Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ расказаў пра далейшыя крокі па забеспячэнні ўстойлівага развіцця беларускай эканомікі. У прыватнасці, ён заявіў, што «цяпер вельмі важна сканцэнтраваць усе намаганні на мэтах эканамічнага развіцця краіны. Пачата распрацоўка пяцігадовай праграмы. Тыя ідэі, якія будуць крышталізавацца ў рамках абмеркаванняў, могуць увайсці ў праграму, якая вызначыць, куды будзем рухацца».

Патрабуецца карэкціроўка заканадаўства

Неабходная ўмова для ўстойлівага развіцця — макраэканамічная стабільнасць. Гэтае паняцце складаецца з двух элементаў — фінансавай і цэнавай стабільнасці. «Менавіта падобныя пытанні мы разглядаем у якасці асноўных мэт Нацбанка. Адпаведныя змены ў заканадаўстве неабходныя для таго, каб мы маглі эфектыўна рэалізоўваць гэтыя задачы, унесеныя на разгляд у органы дзяржаўнага кіравання. Разлічваем на цесны дыялог і ўзаемадзеянне ў гэтай галіне з нашымі калегамі з іншых эканамічных ведамстваў, а таксама на тое, што гэтыя змены будуць падтрыманыя і прынятыя», — адзначыў Дзмітрый Калечыц.

На семінары абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння Нацбанка з Міністэрствам фінансаў. Гаворка вялася пра тое, што «збалансаванасць падаткова-бюджэтнай і пазыковай палітыкі з'яўляецца краевугольным каменем з пункту гледжання эфектыўнасці рэалізацыі нашых мэт і ў цэлым забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці, а значыць, і ўстойлівага эканамічнага росту». СТАР. 2

Гістарычнымі маршрутамі

КАРОЛЬ І КАРАЛЕВА СЯДУЦЬ НА РОВАР...

Унікальны веламаршрут па каралеўскім тракце рыхтуецца ў Гродне

Ён пачнецца ад дома былога гродзенскага старасты Антонія Тызенгаўза і завершыцца каля такога ж аб'екта ў польскай Сакулцы. Агульная працягласць маршрута — 60 кіламетраў, прыблізна па палове з кожнага боку. Падарожнічаць можна на звычайным ровары, тандэме або ровары з электрычнай цягай.

Кароль і каралева на ровары — не проста метафара, гэта лагатып трансгранічнага праекта, які з размахам пачаў рэалізоўвацца па абодва бакі беларуска-польскай граніцы. Аб яго значнасці сведчыць і бюджэт — 2,1 мільёна еўра. Гэтая сума падзелена паміж двума партнёрамі, беларускі бок атрымаў 1,1 мільёна еўра.

— Адсыл да каралеўскай эпохі невыпадковы, — тлумачыць **кіраўнік праекта Сяргей КАЛЯДА.** — Менавіта кароль Станіслаў Аўгуст

Панятоўскі прызначыў таленавітага палітычнага дзеяча і свайго сябра Тызенгаўза гродзенскім старостам, які, у сваю чаргу, здзейсніў тут прамысловую рэвалюцыю. Другая палова XVIII стагоддзя была эпохай росквіту горада, тут ствараліся мануфактуры, адкрыўся першы тэатр, быў забудаваны цэнтр горада, дзе ў той час знаходзілася прыгарадная вёска Гарадніца. СТАР. 6

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Землятрус у Албаніі: ахвяры і сотні пацярпелых

Эпіцэнтр размяшчаўся паміж сталіцай краіны Тыранай і другім па велічыні горадам Дурэсе. Ачаг залягаў на глыбіні 10 кіламетраў. Па звестках сейсмолагаў, услед за землятрусам рушыла чарада афтэршокаў магнітудай вышэй за 5. Штуршкі адчуваліся ў Тыране, а таксама ў Паўночнай Македоніі, Сербіі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіне, Грэцыі, Харватыі і некаторых паўднёвых правінцыях Італіі. Ратавальнікі працягваюць разбіраць завалы, пад якімі могуць знаходзіцца ацалелыя. Разбураны некалькі будынкаў недалёка ад Дурэсе. Да месца трагедыі неадкладна выехаў прэзідэнт краіны Ілір Мета ў суправаджэнні міністра абароны. Паводле слоў прэм'ер-міністра Албаніі Эдзі Рамы, найцяжэйшая сітуацыя склалася ў Дурэсе і Тумана, аднак усе службы актыўна працуюць, каб выратаваць людзей. Улады Албаніі прынялі рашэнне адмяніць заняткі ў адукацыйных установах у трох гарадах рэспублікі — Тыране, Дурэсе і Лежэ. Гэта другі за тры месяцы землятрус у Албаніі.

Ваенная разведка Ірака заявіла пра пагрозу адраджэння «Ісламскай дзяржавы»

Члены «Ісламскай дзяржавы» (ІД) рыхтуюць масавыя ўцёкі сваіх паплечнікаў з турмаў у Сірыі і ў Іраку, што пагражае адраджэннем гэтай арганізацыі нават пасля ліквідацыі яе лідара Абу Бакр аль-Багдадзі, заявіў у інтэрв'ю амерыканскаму каналу CNN кіраўнік ваеннай разведкі Ірака генерал-маёр Саад аль-Алак. Па словах генерала, яго ведамству ўдалося перахапіць звесткі аб падрыхтоўцы масавых уцёкаў тэрарыстаў. «Сусветнай супольнасці трэба прыкласці каласальныя намаганні, каб разабрацца з гэтай праблемай, бо злачынцы могуць пакінуць турмы і вярнуцца ў свае краіны. Яны ўяўляюць вялікую небяспеку для краін Еўропы, Азіі і паўночнага захаду Афрыкі», — падкрэсліў аль-Алак. Ён расказаў, што Багдад даў турэцкім уладам інфармацыю аб дзевяці меркаваных баевіках ІД высокага рангу, бежанцаў з Сірыі і Ірака ў Турцыю. Сярод іх ёсць і тыя, хто адказвае за фінансаванне дзейнасці тэрарыстычнай групоўкі. Паводле інфармацыі аль-Алака, баевікі будуць займацца вярбоўкай новых прыхільнікаў. Ён адзначыў, што двое з іх «адны з найлепшых вытворцаў бомбаў, якія калі-небудзь былі ў ІД».

Tesla атрымала 200 тысяч заказаў на новую мадэль Cybertruck

Праз некалькі дзён пасля прэзентацыі новай мадэлі Cybertruck амерыканская кампанія Tesla атрымала каля 200 тысяч заказаў на футурыстычны браніраваны пікап. Гэтую лічбу кіраўнік кампаніі Ілан Маск паведаміў у Twitter. Ахвотныя набыць Cybertruck могуць зарэзерваваць для сябе адзін з аўтамабіляў, серыйны выпуск якіх плануецца пачаць у 2022 годзе. Для гэтага неабходна заплаціць заклад у суме 100 долараў, які пасля, у выпадку адмовы ад куплі, будзе вернуты. Кампанія — вытворца электрамабіляў у Лос-Анджэлесе прадставіла шасцімесны пікап Cybertruck. На яго дызайн найбольш паўплываў фільм пра Джэймса Бонда «Шпіён, які мяне кахаў», заявіў Ілан Маск. Версія з герметычным салонам стане «афіцыйным пікапам Марса», дадаў ён. Cybertruck будуць выпускаць у трох варыянтах з запасам ходу 250 міль (400 км), 300 міль (480 км) і 500 міль (800 км). Самая хуткая версія зможа разгоніцца да 100 кіламетраў у гадзіну менш чым за тры секунды. Усе версіі новага электрамабіля ад кампаніі Tesla аснашчаны аўтапілотам і адаптыўнай падвескай. Цэны на Cybertruck пачынаюцца з 39 900 долараў.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка накіраваў падзячныя пісьмы аўстрыйскім лідарам за прыём беларускай дэлегацыі ў Вене.**
- Беларусь пераарыентуе пастаўкі цэменту на рынак Еўрасаюза замест Украіны.
- **Каля 15 універсітэтаў Беларусі плануецца мадэрнізаваць за кошт пазыкі Сусветнага банка.**
- Паслугі паштовай сувязі выключаюцца са сферы натуральных манаполій.
- **Бясплатныя кансультацыі правядуць 29 лістапада беларускія натарыусы.**
- У аграгарадку Зэльвенскага раёна з навагодняй назвай Елка адкрыюць рэзідэнцыю Дзеда Мароза.



ТЭМПЕРАТУРА — УНІЗ, ПАЖАРЫ — УВЕРХ

У халодную пару колькасць узгаранняў прыкметна ўзрастае. Гэта вельмі выразна відаць і па сёлетнім лістападзе. Мінулыя выхадныя выдаліся марознымі, і толькі за суботу давялося тушыць паўсотні пажараў, у якіх загінулі шэсць чалавек. За нядзелю звесткі яшчэ горшыя — 38 узгараняў і сем ахвяр. За папярэдні ўік-энд, калі «за бортам» была плюсавая тэмпература, паказчыкі былі куды больш аптымістычныя.

Сітуацыю каментуе **начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый ТУРЧЫН.**

— Пажары пераважаюць у жылым сектары. Гэта звязана з тым, што людзі ў халодную пару года больш знаходзяцца дома. Пячное, электрычнае, награвальнае абсталяванне эксплуатуецца даўжэй і... не заўжды правільна. Дадайце да гэтага тое, што істотная частка пажараў пачынаецца ноччу. У сне чалавек пахі адчувае няздольны.

Але прычына большай часткі ўзгараняў трывіяльная — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Прылёг чалавек адпачыць, закурыў і... заснуў, асабліва калі перад тым вырашыў «пагрэцца» яшчэ і алкаголем. Недакурак вывальваецца з аслабелых рук і падпальвае ўсё вакол сябе. Калі ўлічыць, што сучаснае жытло літаральна нашпігавана матэрыяламі штучнага паходжання, якія падчас гарэння выдзяляюць атрутныя рэчывы ў паветра, то далей усё залежыць ад дзвюх рэчаў. Аптымістычны варыянт — дома працуе аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які сваім пранізлівым піскам абудзіць неабачлівага гаспадара. Але калі яго няма? Тады застаецца спадзявацца на тое, што пажар своечасова ўбачаць суседзі або мінакі. Аднак імавернасць таго, што гэта адбудзецца, калі яшчэ можна выратаваць чалавека, нізкая. А стаўка ў гэтай гульні — жыццё. СТАР. 6

ГАЛОЎНЫ ЭКЗАМЕН — НАПЕРАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«А больш на Алімпіядзе і не трэба. Я асабіста большага ад вас не патрабую. Паўтарыце гэта», — звярнуў увагу беларускі лідар. Асабліва ён адзначыў экіпаж байдаркі-двойкі — Марыну Літвінчук і Вольгу Худзенку. У Венгрыі гэты залаты дуэт двойчы ўздымаўся на найвышэйшую ступень п'едэстала гонару. Падзякаваў Аляксандр Лукашэнка і камандзе, бо ў гэтым відзе спорту і 2-е, і 3-е месцы, і проста выступленні складаюць аснову для перамог вялікіх спартсменаў.

15 узнагарод маладзёжнай і юніёрскай зборнай Беларусі на чэмпіянаце Еўропы ў Рачыцы (Чэхія) — пацвярджэнне не толькі спартыўнага майстэрства атлетаў, але і існавання выдатнай школы веславання ў краіне.

Выклікае павагу, па словах Аляксандра Лукашэнкі, што настаўнікі пастаянна хвалююцца за свой від спорту, за кожнага выхаванца, упарта працуюць, не шкадуючы сіл, часу і здароўя. Нагадаў Прэзідэнт і пра першых трэнераў, якія вучылі чэмпіёнаў азам, заклалі асновы тэхнікі, далі пуцёўку ў вялікі спорт: «Без гэтых першых трэнераў гэты россып узнагарод і гэтая ўрачыстая сустрэча былі б сёння немагчымыя».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў удзельнікам сустрэчы за вялікую работу, волю да перамогі і за высокія вынікі, але нагадаў: галоўны экзамен — наперадзе. Да Алімпіяды ў Токіа засталося практычна паўгода.

«І вы не горш за мяне разумееце, што ў Японіі вас чакае жорсткая, бескампрамісная барацьба ў складаных кліматычных умовах, — заўважыў Прэзідэнт. — Калі вы ўжо ўзялі такую планку, канкрэтызую: вам давядзецца скакаць. Пад планку ні ў якім разе нельга. У вас тытулаваныя сапернікі, якія таксама нацэлены на поспех і вельмі напружана рыхтуюцца да Алімпіяды. Перакананы, што вы зможаце ўсё пераадолець і абавязкова хоць на імгненне, больш не трэба, апярэдзіце канкурэнтаў».

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ Уладзімір ШАНТАРОВІЧ у сваёй прамове адзначыў, што на Алімпіяду спартсмены едуць не веславаць, а біцца за ўзнагароды. І адпраўляцца туды толькі сапраўдныя байцы.

На гэту думку звярнуў увагу і Прэзідэнт. «Той жа хакей, футбол (дзе нам хацелася, каб было так, як у вас) — гэта сёння не спаборніцтва і нават не бітва, як ты сказаў, а вайна. Таму што спорт стаў палітыкай, — сказаў беларускі лідар. — Гэта вайна без правіл».

Абурыўся і асудзіў кіраўнік краіны спартсменаў, якія спаборнічаюць толькі дзеля меркантыльных мэт: «Як магчыма ўвогуле спаборнічаць за грошы? Я не разумею. Спаборнічаць трэба за перамогу. А пасля перамогі прыходзь і патрабуй, што ты лічыш неабходным».

Як прыклад адданых сваёй справе прафесіяналаў Аляксандр Лукашэнка назваў Івана Ціхана і Дар'ю Домрачаву. Дарэчы, Прэзідэнт паведаміў, што Дар'я Домрачава прасіла дазволіць паехаць у Кітай, каб трэніраваць там зборную па біятлоне. На гэта ён даў сваю згоду: «Я кажу: не магу адмовіць, таму што Сі Цзіньпін адмовіць мне потым у іншым».

Лідар дзяржавы звярнуў увагу: неабходна, каб тытулаваныя спартсмены, завяршыўшы кар'еру ў вялікім спорце, заставаліся працаваць трэнерамі. Звяртаючыся да Марыны Літвінчук, Прэзідэнт сказаў: «Мы цябе не адпусцім, пакуль ты ў лодку не пасадзіш яшчэ дваіх ці траіх такіх, як сама».

Кіраўнік краіны паведаміў, што пачаў жорстка падыходзіць да функцыянераў сферы, трэнераў і спартсменаў: неабходныя вынікі. Для асноўных відаў спорту створаны ўсе ўмовы. Прэзідэнт расказаў, што парадаваўся чэмпіёнству футбольнага клуба «Дынама»: «Не таму, што БАТЭ мне не родная каманда. Мне БАТЭ таксама родная каманда, як і ўсе іншыя. І я БАТЭ паабяцаў тады стадыён пабудаваць, калі яны будуць добра гуляць. Як бы ні было складана, мы яго пабудавалі. Але я рады за Брэст, бо з'явілася валявая, канкурэнтная каманда, кіраўнікі, трэнеры — і не за дзяржаўны кошт. Прыйшлі і перамаглі». Прэзідэнт спадзяецца, што ў такой канкурэнцыі пачне адраджацца беларускі футбол.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў гасцям Палаца Незалежнасці моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў у маючых адбыцца выступленнях і нагадаў, што велізарная армія беларускіх балельшчыкаў верыць у іх перамогу.

Таксама Прэзідэнт аб'явіў падзяку за высокі прафесіяналізм, выдатныя спартыўныя вынікі, шматгадовую работу ў сферы і асабісты ўнёсак у забеспячэнне высококваліфікаванага медыцынскага абслугоўвання васьмі спартсменам-інструктарам, трынаццаці трэнерам і двум трэнерам-урачам у гэтым відзе спорту. За выключныя дасягненні і заслугі ў развіцці алімпійскага руху Ордэнам Нацыянальнага алімпійскага камітэта ўзнагароджаны галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ Уладзімір ШАНТАРОВІЧ.

Марыя ДАДАЛКА.

Даведка

Права ўдзелу ў XXXII Алімпійскіх гульнях 2020 года ў Токіа заваявалі 12 беларускіх байдарачнікаў і канаістаў. Яны прадставяць краіну ў сямі нумарах праграмы — байдарка-адзіночка, мужчыны, 1000 м; байдарка-чацвёрка, мужчыны, 500 м; байдарка-адзіночка, жанчыны, 500 м; байдарка-двойка, жанчыны, 500 м; байдарка-чацвёрка, жанчыны, 500 м; каноэ-адзіночка, жанчыны, 200 м; каноэ-двойка, жанчыны, 500 м.

Крокі да ўстойлівасці

Кантраляваць грашовую масу

А вось тэмпы росту крэдытавання банкамі эканомікі захоўваюцца на ўмераным узроўні, паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення прагназавання Галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Аляксандр ЯНУШКЕВІЧ.**

На яго думку, захаванне кантролю над грашовай прапановай дазволіла знізіць інфляцыю і падтрымліваць яе на мэтавым узроўні — каля 5 %. Акрамя таго, запаволенне інфляцыйных працэсаў дазволіла знізіць намінальныя працэнтныя стаўкі ў эканоміцы. Павялічваецца попыт на рублёвыя рэсурсы, і гэта адлюстроўвае працэсы дэвалютызацыі ў эканоміцы і павышэння даверу да беларускага рубля.

Як вядома, пачынаючы з 2015 года рэалізацыя курсавой палітыкі Нацыянальнага банка ажыццяўляецца ў рэжыме плавающага курса. Правядзенне валютных інтэрвенцый дапускаецца з мэтай згладжвання рэзкіх ваганняў курса і для папаўнення золатавалютных рэзерваў. Па бягучых ацэнках, рэальны эфектыўны курс знаходзіцца паблізу свайго раўнаважнага ўзроўню.

У той жа час цэнавая і фінансавая стабільнасць з'яўляецца адной з першарадных умоў забеспячэння ўстойлівага і збалансаванага росту любой эканомікі. «Нацбанк у сваёй дзейнасці прытрымліваецца гэтых прынцыпаў. Цэнавая стабільнасць з'яўляецца асноўнай мэтай грашова-крэдытнай палітыкі, якая з 2015 года рэалізуецца ў рэжыме манетарнага таргетавання. Нацбанк праводзіць неабходныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы для пераходу да таргетавання інфляцыі», — адзначыў спецыяліст.

Чым небяспечнае празмернае змякчэнне манетарнай палітыкі?

У нашай краіне назіраецца макраэканамічная стабілізацыя, але яна не стане прычынай запаволення эканамічнага росту, лічыць **старшы навуковы супрацоўнік Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра BEROC Дзмітрый КРУК.**

«Калі мы гаворым пра ўстойлівыя тэмпы росту, адказныя за ўзровень даходаў, то да іх манетарная палітыка не мае роўным лікам ніякага дачынення. На кароткатэрміновыя тэмпы росту такая палітыка сапраўды можа аказваць некаторы ўплыў», — заявіў эксперт.

Таму важна, каб усе ў краіне нарэшце пагадзіліся з тым, што манетарная палітыка не можа і не павінна быць задзейнічана ў вырашэнні праблем росту ў сярэднетэрміновай перспектыве. Навуковы супрацоўнік таксама звярнуў увагу на тое, што могуць быць фактары, якія абумоўліваюць неабходнасць больш актыўнага падыходу да манетарнай палітыкі. Бываюць выпадкі, калі слабы выпуск грашовай масы абвастрае сацыяльныя выклікі. Сітуацыю прапануецца вырашаць у тым ліку з дапамогай стымулюючай палітыкі, часткова ва ўрон паказчыкам макраэканамічнай стабільнасці.

Іншую думку выказваюць банкі, гаворачы аб прынцыпе найменшага зла. Бо з запаволеннем тэмпаў росту эканомікі з сярэдзіны 2018 года шматлікім пазычальнікам зноў стала складаней плаціць па даўгах. Такім чынам, трэба прыняць гэта пад увагу і праводзіць больш актыўную палітыку, працягнуў Дзмітрый Крук.

«Але калі казаць пра тое, што трэба мэтанакіраванае стымуляванне выпуску за кошт манетарнай палітыкі, то большасць ужо прызнае, што гэта не працуе», — адзначыў спецыяліст BEROC. Ён таксама спыніўся на тым, што манетарнай палітыцы трэба пэўная ступень абароны, бо колькасць шокаў, якія могуць паўплываць на манетарнае асяроддзе, даволі вялікая.

Інфляцыйным чаканням патрэбен «якар»?

У 2015—2016 гадах вялася стрымальная манетарная палітыка. Але ключавы фактар, які тлумачыць значную частку таго, што адбывалася ў Беларусі апошнія пяць гадоў, — высокія інфляцыйныя чаканні. Яны да пачатку 2015 года ўзляцелі да нябёс, што прывяло да досыць жорсткай палітыкі Нацбанка, якому важна было не даць ім рэалізавацца. Праблема ў тым, адзначыў эксперт, што ў нашай краіне інфляцыйныя чаканні застаюцца незаякаранымі.

Інфляцыя і інфляцыйныя чаканні маюць моцныя двухбаковыя прычынна-выніковыя сувязі. Чаканні ўплываюць на інфляцыю, а інфляцыя — на чаканні. У Беларусі гэтыя сувязі вельмі моцныя. Значна лепшай з'яўляецца сітуацыя, калі ў вас на інфляцыйныя чаканні фактычны ўзровень інфляцыі ўплывае істотна менш. Гэта называецца заякарэнымі інфляцыйнымі чаканнямі. Так бывае, калі ўлады змаглі дамагчыся сітуацыі, пры якой ім давяраюць настолькі, што эканамічныя шокі не выліваюцца ва ўсплёск інфляцыйных чаканняў. У нас жа гэтыя сувязі моцныя і двухбаковыя.

Дзмітрый Крук не раіць больш актыўна знімаць працэнтныя стаўкі, пакуль не заякараны інфляцыйныя чаканні. У адваротным выпадку ўзнікае рызыка пераходу эканомікі ў аварыйны рэжым. Эксперт шматзначна заўважыў, што стан манетарнай палітыкі блізкі да нейтральнага, і гэта ўжо вялікае дасягненне на фоне 2011 года. І адбылося гэта дзякуючы зніжэнню інфляцыйных чаканняў. Але пакуль — з двухбаковымі сувязямі...

Сяргей КУРКАЧ.

Блізкая ўлада

ВАС СЛУХАЕ ГУБЕРНАТАР...

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ падчас прамой тэлефоннай лініі ў мінулую суботу за тры гадзіны выслухаў больш за трыццаць заяўнікаў.

Гэтым разам вельмі актыўна тэлефанавалі жыхары абласнога цэнтра. Напрыклад, паведамілі, што на вуліцы Багатырова ў мікрараёне Білева некалькі месяцаў не прыбіраюць прахадны двор.

А ў другой частцы Віцебска — на вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў — у шматпавярховым доме праблема з вентыляцыйнай сістэмай. Заяўніца абуралася, што ў выніку пыл і бруд трапляюць у кватэры. Мікалай Шарснёў, дарэчы, сказаў, што і ў яго жыллі аналагічная бяда, даводзіцца лішні раз праветрываць, адчыняючы вокны...

Жыхарка дома па вуліцы Марка Шагала (былая «Праўды») абурана суседствам з шумнай начной кавярняй-клубам (знаходзіцца ў падвале дома — помніка архітэктуры па вуліцы Леніна). Маўляў, наведвальнікі выходзяць на вуліцу, каб пагаманіць, пакурыць, а то і адносіны высвятліць... Прысутны ў кабінеце прадстаўнік УУС сказаў, што асаблівых праблем тыя, хто адпачывае ў кавярні, не ствараюць. Але па просьбе губернатара яшчэ больш узмоцніцца кантроль за парадкам.

Званок з Сенненскага раёна наконт забароны эколагаў нарыхтоўваць дровы актуальны для ўсёй краіны. Пенсіянер расказаў, што тэлефануе па просьбе землякоў. Сказаў, што нельга спілаваць сукі старых дрэў, кустоўя нават у ямах, каля дарог, у тых месцах, дзе, па логіцы, трэба наводзіць парадак. Мікалай Шарснёў і раней чуў пра гэта ад заяўнікаў. І чарговы сігнал стаў падставай для вывучэння мэтазгоднасці абмежаванняў, калі іх, як кажуць, ужо занадта. Губернатар агучыў ідэю запрасіць да абмеркавання тэмы ў Віцебску кіраўніцтва Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Зразумела, здаровае дрэва пілаваць нельга! Але ў іншых выпадках?

Званок з Лёзненскага раёна таксама датычыўся дрэў. Жыхарка аграгарадка прасіла паспрыяць у спілоўванні старых дрэў на могілках. А таксама пацікавілася, калі вада з кранаў у жыллі будзе чыстая. На Віцебшчыне, між іншым, рэалізуецца адпаведная праграма па ўстаноўцы ў населеных пунктах глыбінкі станцый па ачыстцы вады паводле еўрапейскіх стандартаў. Губернатар запатрабаваў інфармаваць пра гэта людзей і распаўсюджваць канкрэтныя планы: калі і дзе будзе пабудаваны аб'ект. Чакаць засталося ўсяго некалькі гадоў — максімум тры.

Навапалачанка пацікавілася, ці пабудуюць анкалагічны комплекс, бо сваі ж забілі ў зямлю ў свой час. Кіраўнік Полацкага райвыканкама па просьбе губернатара пракаментаваў тэму. Каля дзесяці гадоў таму распачыналі будаўніцтва, але не хапіла грошай, каб дабудаваць. Ды яшчэ вельмі шмат спатрэбіцца фінансаў, каб аснасціць медыцынскую ўстанову неабходным абсталяваннем. Пры гэтым і ў Віцебскім абласным клінічным анкалагічным дыспансеры, як падкрэсліў губернатар, трэба яшчэ многае зрабіць, каб ён адпавядаў патрабаванням часу. Таму распыляць грошы неразумна.

Па традыцыі губернатар папрасіў свайго памочніка патэлефанаваць некаторым заяўнікам, каб пачуць ад іх, ці выканана ранейшае даручэнне, і даведацца, наколькі якасна.

Да гэтай прамой лініі Мікалай Шарснёў быў на сувязі з жыхарамі Віцебшчыны ў ліпені і ў выніку даў 37 даручэнняў. З іх 30 выкананы. Усяго ў аблвыканкаме падчас аналагічных мерапрыемстваў зарэгістравалі сёлета 565 зваротаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога начальніка ўпраўлення па ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Сакратарыята Савета Рэспублікі СЦЕПАНЕНКІ Аляксея Мікалаевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник – пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации:

В течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района:

– жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2015 г. – март 2016 г.;

– жилой дом № 1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: сентябрь 2015 г. – июнь 2017 г.;

– жилой дом № 21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2017 г. – октябрь 2018 г.;

– жилой дом № 5 по Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: апрель 2018 г. – июнь 2019 г.

Информация об объекте строительства:

Цели строительства – строительство жилого дома в составе объекта «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой» в д. Копище Минского района.

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:

начало строительства – май 2018 года;

окончание строительства – август 2020 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации:

положительное заключение государственной экспертизы от 23 марта 2018 г. № 241-70/18, выданное дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по Минской области».

Сведения о месте нахождения объекта строительства:

Местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище; микрорайон № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района.

Характеристика объекта строительства:

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома № 35 по генплану (далее – «жилой дом») в составе третьего пускового комплекса микрорайона № 1 Жилого района «Копище» по индивидуальному проекту.

В соответствии с определением, приведенном в Указе Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667, здание жилого дома относится к домам типовых потребительских качеств.

Жилой дом – здание 148-квартирного жилого дома, 25-этажное, односекционное с подвалом и техническим «теплым» чердаком. На первом этаже размещены встроенные помещения административного назначения с отдельными входами. В уровне подвала размещен встроенно-пристроенный гараж-стоянка на 46 машино-мест. Жилой дом расположен вдоль ул. Подгорная. Заезд к жилому дому осуществляется с ул. Лопатина. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с частичным использованием в качестве несущих элементов кладочного заполнения стен. Фундаменты свайные с монолитными железобетонными ленточными и столбчатыми ростверками. Наружные и внутренние стены техподполья – монолитные железобетонные. Колонны – монолитные железобетонные. Наружные и внутренние несущие стены жилой части из керамических поризованных блоков. Перегородки из газогребневых полнотелых керамзитобетонных блоков. Перекрытия и покрытие – монолитные железобетонные плиты. Утепление наружных стен предусмотрено легкой штукатурной системой с минераловатными плитами. Лестницы – монолитные железобетонные марши и площадки. Кровля жилого дома – малоуклонная с покрытием из двух слоев кровельного материала. Кровля гаража-стоянки – эксплуатируемая под озеленение и автомобильные нагрузки с покрытием из тротуарных плит. Здание оборудовано тремя лифтами. Внутренняя отделка мест общего пользования предусмотрена с окраской стен, устройством плиточных полов и подвесных потолков.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы панельные. Вентиляция жилых помещений естественная. Вентиляция помещений кухонь, ванных и санузлов осуществляется через унифицированные вентблоки. Вентиляция гаража-стоянки – приточно-вытяжная с механическим побуждением. Здание оборудовано раздельными системами хоз-питьевого и противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из вневкартирных коридоров, система подпора воздуха в шахты лифтов. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной разводки электропроводки. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры в этажных щитах. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Технико-экономические показатели жилого дома: количество жилых этажей – 25; количество секций – 1; количество квартир – 148, в том числе: однокомнатных – 51 (общей площадью от 38,17 до 41,63 кв. метров), двухкомнатных – 72 (общей площадью от 56,46 до 61,68 кв. метров), трехкомнатных – 25 (общей площадью 71,24 и 73,15 кв. метров). Общая площадь квартир – 7977,07 кв. метров.

Строительная готовность жилых помещений:

– частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;

– вентиляция – естественная по схеме: приток через окна, вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;

– электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой розеток, выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты;

– горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель;

– канализация – стояк, установка и подключение унитаза;

– отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);

– окна и двери на лоджии – из ПВХ-профиля со стеклопакетом;

– остекление лоджий – из ПВХ-профиля со стеклопакетом;

– телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;

– видеодомофон;

– дверь входная деревянная;

– пожарный шланг;

– автономный пожарный извещатель.

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика (на дату опубликования проектной документации):

– 5 (пять) однокомнатных квартир общей площадью по проекту от 38,17 до 41,63 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 2 750 (две тысячи семьсот пятьдесят) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период по графику платежей – 2 850 (две тысячи восемьсот пятьдесят) белорусских рублей;

– 20 (двадцать) двухкомнатных квартир общей площадью по проекту общей площадью от 56,46 до 61,68 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 2 500 (две тысячи пятьсот) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период по графику платежей – 2 600 (две тысячи шестьсот) белорусских рублей;

– 5 (пять) 3-комнатных квартир общей площадью по проекту от 71,24 до 73,15 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 2 350 (две тысячи триста пятьдесят) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленный договором период по графику платежей – 2 450 (две тысячи четыреста пятьдесят) белорусских рублей.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.

2. Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляются, начиная с первого рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящей декларации, в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договоров создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договоров осуществляется при заключении договоров. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену договора (цену объекта долевого строительства) в случаях изменения прогнозных индексов цен в строительстве в нормативный срок строительства объекта строительства и дополнительный срок строительства при продлении нормативного срока строительства в установленном законодательством порядке в случае отсутствия вины застройщика, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в указанные сроки, если они оказали влияние на цену договора (цену объекта долевого строительства).

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Данные о вещном праве на земельный участок, предоставленный застройщику для строительства объекта долевого строительства, его границах и площади, элементах благоустройства:

Земельные участки находятся в постоянном пользовании ООО «СИ-трейдинг» с целевым назначением для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой, смотровых колодцев и инженерных сетей по объекту «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой». Свидетельство (удостоверение) №№№ 600/1072-14293, 600/1072-14292, 600/1072-14291, 600/1072-14290, 600/1072-14289 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право постоянного пользования) с кадастровым номером 623680604101000376 площадью 0,5308 га, с кадастровым номером 623680604101000375 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000374 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000373 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000372 площадью 0,0001 га, расположенные по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, составленные РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру 24 мая 2019 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, включая строительство площадок для парковки легкового автомобильного транспорта, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества: два встроенных помещения административного назначения с отдельными входами на первом этаже, машино-места в подземном гараже-стоянке, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: август 2020 года.

Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком: договор строительного подряда № 22/05-2018 от 22.05.2018 г., заключенный застройщиком со Строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Алена Ражанкевіч стварае ў асноўным вялікія вырабы — паліто, сукенкі. Усе яны выкананы ў адзінкавым экзэмпляры. Аўтар кажа, што не любіць паўтарацца, ёй нецікава рабіць яшчэ адзін такі самы выраб, таму ў адзенні ад Ражанкевіч можна быць упэўненым, што другой такой рэчы не існуе наогул. Напрыклад, на адну доўгую сукенку з вельмі яскравым арнаментам у майстрыхі пайшло 20 метраў шоўку. Матэрыял прывозяць з Узбекістана. І шоўк павінен быць абавязкова натуральны, інакш палатно не будзе мець такой гнуткасці. Некаторыя рэчы, напрыклад доўгую сукенку, можна надзяваць на два бакі, што робіць іх яшчэ больш прывабнымі. Сама жанчына носіць у асноўным уласныя рэчы, якія лічыць другой скурай — яны такія ж цёплыя і далікатныя. Таму і сваю калекцыю назвала адпаведна «Для сябе, любай». Уразіў лёгкі паланцін, аснову якога склала рознай формы лісце. Вядома, не кожны можа дазволіць сабе перайсці на эксклюзіўнае адзенне, але мець адну ці некалькі такіх рэчаў сапраўды прыемна, бо яны і прыгожыя, і экалагічныя, і валодаюць неверагодна станоўчай энергетыкай.

Мадэлі прадэманстравалі навучэнкі каледжа тэхналогіі і дызайну. Будучыя дызайнеры, удзельніцы народнага тэатра моды «Маладосць» Вольга і Дар'я лічаць, што такія сукенкі, паланціны, жакеты можна насіць як штодзённа, так і на розныя імпрэзы. На іх і вока адпачывае, і душа. А будучым мадэльерам ёсць чаму павучыцца.

— Свята валення воўны праходзіць трэці раз, — кажа **дырэктар Цэнтра «Спадчына» Марына ЧЫКУН.** — Гэта стала брэндавай імпрэзай, да якой мы стараемся далучыць як мага больш майстроў. Калекцыі атрымліваюцца разнастайныя, бо кожны мае сваю тэхніку, свой творчы падыход. Напрыклад, цяпер вельмі папулярны нунафелтынг, калі шэрсць спалучаецца з іншай тканінай — шоўкам, марляй. З новымі тэхнікамі ёсць магчымасць здзіўляць свет і арыгінальнымі творамі.

У Цэнтры «Спадчына» модны паказ спалучылі з майстар-класам. Па словах вопытных майстроў, валенне — працэс нескладаны, навучыцца можа бадай што кожны. Галоўнае — асвоіць тэхніку. Пенсіянерка Ірына Пятроўна, хоць і пачатковец у рамястве, ужо зрабіла сабе пацеркі і зараз дэманструе працэс стварэння паланціна. Ён будзе ў палоску з некалькіх колераў — жоўтага, шэрага і зялёнага. Для гэтага раскладзеная адпаведна воўна скручваецца з доўгай палімернай стужкай, змочваецца мыльным растворам (які будзе потым змыты) і валіцца. Гэта працэс працяглы і займае не менш за дзве гадзіны.

— Я займаюся на курсах некалькі месяцаў, — расказвае Ірына Пятроўна. — А прыйшла, каб дома не сядзець, бо вельмі самотна бывае.

Дарэчы, жанчына асвоіла і тэхніку пляцення з папяровых трубачак. Спляла кошык для бялізны ў ванны пакой. Некаторыя нават палічылі, што ён з крамы. Для пенсіянера такія навыкі — добрая дапамога бюджэту, усміхаецца майстрыха.

Для чалавека з інваліднасцю такое рамяство — таксама пэўная падтрымка ў жыцці. Іна па прафесіі праекціроўшчык, але, атрымаўшы інваліднасць, не працуе. У Цэнтр рамёстваў прыйшла выпадкова, а цяпер у ліку найлепшых вучаніц. Напачатку зрабіла пацеркі і падаравала сяброўцы. Тая захацела яшчэ і шалік.

— Я яго рабіла ажурным на нітачнай аснове. Раскладвала ўзорам ніткі, зверху воўну і ўсё гэта валіла, — расказвае Іна. — Тэхніка мокрага валення аднолькавая ва ўсіх рэчаў, розніца — у дэкоры, выкрайцы. Бывае, што дробны ўзор «плыве», тады яго трэба набіваць «сухім» спосабам, звычайна іголкамі. Такім чынам можна зрабіць і ёлачныя цацкі, нейкія ўпрыгажэнні, нават нанесці малюнак на вязаныя вырабы.

Вельмі важна, лічыць Іна, каб чалавек быў чымсьці заняты. А пры такім прыгожым, а часам і нечаканым выніку гэты занятак двойчы прыемны.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Класныя навіны

STEM-клас па заяўцы....

На Міншчыне набірае абароты ўнікальны праект «Мабільны STEM-клас»

Гэта сумесная ініцыятыва Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, накіраваная на папулярызацыю STEM-адукацыі.

Задача ініцыятараў адукацыйнага праекта — павялічыць колькасць STEM-педагогаў у Мінскай вобласці для рэалізацыі сучаснай мадэлі STEM-навучання. Апошняя прадугледжвае фарміраванне ў школьнікаў міжпрадметных ведаў для паспяховай праектнай работы ў галіне навуковых і інжынерных тэхналогій.

Выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі і найлепшыя педагогі-практыкі Мінскай вобласці выязджаюць ва ўстановы адукацыі сталічнага рэгіёна, дзе навучаюць педагагічных работнікаў робататэхніцы, праграмаванню, 3D-мадэляванню, дапоўненай і віртуальнай рэальнасці і іншым кірункам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Навучанне праходзіць інтэнсіўна — у форме трохдзённага практыка-арыентаванага семінара.

У пачатку першага дня слухачы даведваюцца пра тэндэнцыі, перавагі і перспектывы STEM-адукацыі. Далей іх чакае знаёмства з канструяваннем робататэхнічных прылад на аснове Arduino. Заняткі ў форме майстар-класа праводзіць выкладчык кафедры інфарматыкі і методыкі выкладання інфарматыкі БДПУ імя Максіма Танка Дзмітрый Малахоўскі.

Наступны дзень аддаецца спаборніцкай і адукацыйнай робататэхніцы на базе канструктараў Lego Mindstorms EV3. Майстар-клас праводзіць начальнік аддзела ўкаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Андрэй Тычынскі. Педагогі знаёмяцца з адукацыйнымі наборамі Lego Mindstorms, а таксама даведваюцца, у якіх адукацыйных праектах прымяняюцца робататэхнічныя наборы Lego, атрымліваюць падрабязную інфармацыю аб абласных, рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах па робататэхніцы.

Апошні дзень семінара прысвечаны 3D-праектаванню і мадэляванню. Педагогі атрымліваюць навыкі работы ў такіх праграмах, як Google Scratch Up, Lego Digital Designer, Paint 3D, Unity, а таксама робяць свае першыя мабільныя праграмы. У гэтым ім дапамагае Пётр Кушняроў, стваральнік шэрагу віртуальных падручнікаў, дырэктар сярэдняй школы № 22 Барысава.

Варта адзначыць, што праект набірае абароты. Мабільны STEM-клас ужо наведаў установы адукацыі Чэрвеньскага і Пухавіцкага раёнаў. А 25—27 лістапада яго прымае гімназія № 1 Любані.

Выезды мабільнага STEM-класа праходзяць па папярэдне вызначаным плане. Любая ўстанова адукацыі можа зрабіць заяўку на ўдзел у мерапрыемствах праекта. Для гэтага дастаткова патэлефанаваць у Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі і дамовіцца аб візіце STEM-класа.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Суайчыннікі

БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ Ў ЛАТВІІ

У мінулыя выхадныя ў Рызе ў Палацы культуры «Ziemelblazma» прайшоў першы Конкурс беларускай песні Латвіі. Арганізатарам конкурсу выступіла пасольства Беларусі ў Латвіі пры падтрымцы Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Як расказаў «Звяздзе» першы сакратар пасольства Беларусі ў Латвіі Аляксей Васількоў, у мерапрыемстве ўзялі ўдзел 16 калектываў з дзевяці гарадоў Латвіі, якія выконваюць песні на беларускай мове і песні беларускіх аўтараў. Гран-пры конкурсу (запіс дыска ў прафесійнай студыі) атрымаў ансамбль беларускай песні «Журавінка» з Вентспілса, пераможцамі сярод дзіцячых калектываў сталі ансамбль Рыжскай беларускай асноўнай школы імя Янкі Купалы «Вавёрачка» і дзіцячая студыя «Скарбніца» з Даўгаўпілса. Усе тры ансамблі-пераможцы прадставяць беларускую дыяспару Латвіі на Фестывалі мастацтваў беларусаў свету ў 2020 годзе.

Сродкі на правядзенне першага Конкурсу беларускай песні Латвіі часткова выдаткаваны за кошт Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады (падпраграма «Беларусы ў свеце»).

Хакей

МІНСК АДКРЫВАЕ ЗОРАК

З 9 да 15 снежня «Чыжоўка-Арэна» прыме адну з самых значных спартыўных падзей 2019 года ў Беларусі — Чэмпіянат свету па хакеі сярод маладзёжных (да 20 гадоў) зборных (дывізіён I, група А). Зборная Беларусі будзе змагацца за права выхаду ў элітную групу, яе сапернікамі стануць каманды Аўстрыі, Даніі, Латвіі, Нарвегіі і Славеніі.

Для маладых хакеістаў чэмпіянат свету ў Мінску — рэальная магчымасць заявіць пра сябе на вачах прадстаўнікоў топ-клубаў, у тым ліку паўночнаамерыканскіх. Турнір у Мінску наведае больш за 40 скаўтаў з НХЛ і КХЛ, прыедуць менеджары «Нью-Джэрсі», «Тампы-Бэй», «Нэшвіла», «Сан-Хасэ», «Чыкага», «Пітсбурга», «Вашынгтона» і іншых клубаў НХЛ. Гэта адкрывае перад удзельнікамі турніру прывабныя перспектывы для далейшага працягу кар'еры.

З 1 кастрычніка ў продаж паступілі білетныя пакеты на ўсе матчы чэмпіянату і на паядынкі маладзёжнай зборнай Беларусі. Спецыяльная зніжка дзейнічае для ўладальнікаў клубных картаў і абанементаў ХК «Дынама-Мінск», а таксама для ўладальнікаў абанементаў клубаў чэмпіянату Беларусі. Білеты дзеляцца на чатыры цэнавыя катэгорыі: «Прэміум», «Стандарт», «Эканом» і «Эканом Плюс». Кошт білетаў на адзінкавыя матчы маладзёжнай зборнай Беларусі вар'іруецца ад 6 да 23 рублёў. У сваю чаргу, кошт білетаў на матчы з удзелам астатніх зборных камандаў складзе ад 3 да 9 рублёў.

Нагадаем, у снежні 2018 года маладзёжная зборная Беларусі таксама выступала ў дывізіёне ІА. Турнір праходзіў у Германіі, і адзіную пуцёўку ў эліту заваявалі тады гаспадары.

Самым паспяховым адрэзкам у гісторыі беларускай «маладзёжкі» быў перыяд з 2000 да 2003 года, калі зборная пад кіраўніцтвам Уладзіміра Меленчука на працягу трох сезонаў запар выступала ў эліце. Акрамя яго, ніводнаму спецыялісту не ўдавалася захаваць прапіску ў найманейшым дывізіёне хоць раз.

Расклад чэмпіянату свету:

9 снежня
12:30. Нарвегія — Славенія
16:00. Данія — Латвія
19:30. Беларусь — Аўстрыя
10 снежня
12:30. Славенія — Данія
16:00. Аўстрыя — Нарвегія
19:30. Латвія — Беларусь
12 снежня
12:30. Славенія — Латвія
16:00. Данія — Аўстрыя
19:30. Беларусь — Нарвегія
13 снежня
12:30. Латвія — Аўстрыя
16:00. Нарвегія — Данія
19:30. Беларусь — Славенія
15 снежня
12:30. Аўстрыя — Славенія
16:00. Нарвегія — Латвія
19:30. Данія — Беларусь.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ТЭМПЕРАТУРА — УНІЗ, ПАЖАРЫ — УВЕРХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На працягу дзесяцігоддзяў мы адзначаем пік пажараў і гібелі ў іх людзей з кастрычніка да сакавіка, — працягвае Дзмітрый Турчын. — Вастрыня гэтага «піку» прыпадае на самыя цёмныя месяцы года — снежань і студзень. За 10 месяцаў сёлета мы фіксуем нязначнае павелічэнне колькасці пажараў, прыблізна 4 %, пры гэтым адзначаецца істотнае зніжэнне колькасці загінулых — на 11 %. Прычым калі паглядзець звесткі 2010 года, то тады ад пажараў гінула больш за тысячу чалавек. І не можа не радаваць тое, што сёлета вельмі малая колькасць загінулых ад агню дзяцей. Калі летась іх было дзевяць, то сёлета — два. Пры гэтым трэба ўлічыць, што адной з дзвюх ахвяр агню зусім крыху не хапіла да васямнаццаці гадоў, ды і тое падлетак, як пасля паказала судова-медыцынская экспертыза, быў нецвярозы... На нашу думку, поспех у тым, што нашы дзеці вучацца бяспецы жыццядзейнасці, па сутнасці, з дзіцячага садка.

З 16 кастрычніка да 1 лістапада ў краіне праводзілася акцыя «За бяспеку разам». Камісіі, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі МУС, Мінадукацыі, Мінэнергетыкі, Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства, наведвалі людзей з групы рызыкі — старых, якія жывуць адны, прыходзілі ў шматдзетныя сем'і і тыя, дзе малыя знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

— Мы завіталі да 370 тысяч чалавек па месцы жыхарства. Дзякуючы камісіям у 287 дамах была прыведзена ў нармальны стан электрычная праводка. Яшчэ амаль у 600 дамах адрамантавалі печы. Але калі дапамагчы няма каму, то мы просім гэта зрабіць кіраўнікоў прадпрыемстваў, працы на якіх цяперашнія пенсіянеры аддалі калісьці не адзін дзясятак гадоў жыцця. Прычым нам вельмі прыемна, што ў Беларусі прыжыліся абследаванні жылля па заяўным прынцыпе. Гэта значыць, што калі чалавек не ўваходзіць у зону рызыкі, але хоча праверыць свой дом, то супрацоўнікі пажарнага нагляду гатовы прыехаць да яго і ўсё растлумачыць.

Што да апавяшчальнікаў, то сёлета 1700 такіх прыбораў было аб'яднана ў сетку. Гэта значыць, што гукавы кампанент выводзіцца і на фасад дома. Так зроблена для таго, каб суседзі маглі даведацца, што тут адбываецца пажар, і пры магчымасці разбудзіць і выцягнуць пагарэльца яшчэ да прыезду падраздзяленняў ратавальнікаў.

— Тут трэба адзначыць адзін адметны факт. З 2002 года аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі выратавалі 2335 жыццяў. Прычым за 10 месяцаў гэтага года на іх рахунку — 73 ацалелыя чалавекі, у тым ліку 22 дзіцяці. Гэта лічбы вельмі сур'ёзныя. Таму хачу звярнуцца да ўсіх — калі вы яшчэ не паставілі апавяшчальнік з нейкай прычыны, то зрабіце гэта. Прылада гэта вельмі танная і простая. Якога-небудзь дадатковага абслугоўвання яна не патрабуе, за выключэннем таго, што з цягам часу трэба мяняць элемент сілкавання. Але якаснай батарэйкі павінна хапіць больш чым на год.

Ад панядзелка ратавальнікі пачынаюць рыхтавацца да навагодніх свят. Яны правядуць традыцыйную акцыю «Бяспечны Новы год». А мы раскажам у наступным выпуску нашай рубрыкі пра тое, як жа правесці гэтыя дні з мінімальнай рызыкай.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

● **Тым часам**

МНС прапаноўвае вызваліць ад дзяржаўнай рэгістрацыі некаторыя маламерныя судны

Вяслярныя маламерныя судны, маторныя лодкі з рухавіком магутнасцю да пяці конскіх сіл і паруснікі даўжынёй не больш за пяць метраў могуць быць вызвалены ад неабходнасці дзяржрэгістрацыі і перыядычнага тэхнічнага агляду. Але норма запрацуе толькі тады, калі будзе прыняты адпаведны законапраект. Разам з тым дзяржаўны нагляд за бяспекай суднаходства будзе ажыццяўляцца работнікамі Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах незалежна ад тыпу плавальнага сродку.

Праект указа, якім уносяцца змяненні ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2013 года № 332, вынесены на грамадскае абмеркаванне. З ім можна азнаёміцца на прававым форуме Беларусі да 5 снежня.

Катэгорыі маламерных суднаў, у дачыненні да якіх прапануецца выключыць неабходнасць правядзення адміністрацыйных працэдур, вызначаны на падставе шматлікіх рабочых сустрэч з суднаўладальнікамі, а таксама з улікам іх патэнцыйнай небяспечнасці падчас эксплуатацыі. Такім чынам, пад дзеянне законапраекта трапляюць пераважна малыя ціхаходныя судны. Іх у краіне прыблізна каля паловы ад агульнай колькасці падкантрольных Інспекцыі. Пераважна гэтыя плавальныя сродкі выкарыстоўваюць для таго, каб лавіць рыбу. Разам з тым 95 % аварый прыпадае якраз на хуткаходныя маламерныя судны. І для іх дзяржаўная рэгістрацыя застанецца абавязковай.

Акрамя таго, законапраект прадугледжвае пашырэнне паўнамоцтваў супрацоўнікаў Інспекцыі. Мяркуецца, што яны змогуць выдаваць, абменьваць, ануляваць і канфіскоўваць міжнародныя пасведчанні на права кіравання маламерным суднам. Таксама ім будзе значна прасцей атрымліваць асабістую інфармацыю пра затрыманых парушальнікаў.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29
Предмет аукциона:	
Лот № 1 – административное здание (здание нежилое), общ. пл. **1147,2 кв. м**, инв. № **330/С-12431**, по адресу: **Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Крупской Н. К., 14.** Составные части и принадлежности: подвал, крыльцо с пандусом. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,0740 га для государственных нужд. Начальная цена с НДС 20 % – **1 017 768,96 бел. руб.**	
Лот № 2 – имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 55. **– Банк** (здание специализированное финансового назначения), общ. пл. **2517,5 кв. м**, инв. № **610/С-2280**. Составные части и принадлежности: подвал. **– Автостоянка** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) общ. пл. **426 кв. м.**, инв. № 610/С-56998. Составные части и принадлежности: автостоянка, бордюр, площадка для мусороконтейнера, ограждение. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,3476 га для обслуживания здания банка и автостоянки. Начальная цена с НДС 20 % – **2 888 040,00 бел. руб.**	
Лот № 3 – имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пер. Партизанский, д. 1 **– Здание банка** (здание специализированное финансового назначения), общ. пл. **1 100 кв. м**, инв. № **630/С-48523**. Составные части и принадлежности: бетонный подвал. **– Здание гаража** (здание специализированное иного назначения) общ. пл. **204,3 кв. м**, инв. № 630/С-48531. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,3844 га для размещения объектов финансового назначения. Начальная цена с НДС 20 % – **1 314 576,00 бел. руб.**	
Дополнительная информация по лотам №№ 1–3: При приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок заключения договора купли-продажи – 20 календарных дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества. Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона: 31.12.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». **Заявления на участие принимаются по 30.12.2019** до 16.00 по указанному адресу	
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

КАРОЛЬ І КАРАЛЕВА СЯДУЦЬ НА РОВАР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Частка былой Гарадніцы захавалася да гэтай пары, у тым ліку і дом Тызенгаўза. Двухпавярховы асабняк размешчаны ў самым цэнтры гістарычнай часткі горада, на плошчы, якая носіць імя славутага рэфарматара. Менавіта адсюль і пачнецца веламаршрут, які звяжа два тыповыя будынкі ў Гродне і польскай Сакулцы. Абодва пабудаваны амаль 250 гадоў таму Тызенгаўзам па праектах праслаўленых італьянскіх архітэктараў Мёзера і дэ Сака. Абодва будынкі будуць трансфармаваны пад турыстычныя патрэбы.

— Гэта ўнікальны прадукт, якога пакуль у нас не было. Турыст зможа пазнаёміцца з агульнай гістарычнай спадчынай дзвюх краін, праехаўшы на ровары цераз граніцу па вызначанай веладарожцы. Яе пабудуюць вясной наступнага года, і часткова яна пройдзе не побач з аўтадарогай, а па прасецы. Маршрут ужо мае нумар — 434, — расказаў Сяргей Каляда.

Сам дом Тызенгаўза будзе прыстасаваны пад шматфункцыянальны турыстычны цэнтр. Цяпер тут вядуцца будаўнічыя работы. Усё начынне амаль разабрана, у тым ліку і старажытная плінфа, якая будзе выкарыстана паўторна. Сяргей Каляда звяртае ўвагу на рамы — яны дубовыя і захаваліся з часоў будаўніцтва. Пад столлю відаць пласты чароту. Аказваецца, такім чынам уцяплялі пабудову. Чарот у мэтах пажарнай бяспекі давядзецца замяніць, але кавалачак аўтэнтычнага матэрыялу застанецца для агляду.

Мяркуецца, што асноўная зала будзе вытрымана ў каралеўскім стылі — гэта зала для афіцыйных сустрэч, прыёму дэлегацый. Разам з тым — з сучасным медыйным начыннем. Каб яе пашырыць, будуць разабраны сцены і частка столі. Прадугледжана і канцэртная зала — у стылі музычнага салона. Яшчэ адзін важны штрых — карцінная галерэя, якая перайдзе з будынка насупраць. Цяпер выстаўка гродзенскіх мастакоў месціцца ў падвальным памяшканні гістарычнага будынка, таксама ўзведзенага Тызенгаўзам.

Паколькі аб'ект гістарычны, кожны крок патрабуе навуковага суправаджэння. Самай праблемнай часткай можна лічыць аднаўленне падвала, дзе трэба зрабіць гідраізаляцыю. Яна будзе весціся знутры падвальнага паверха, такі вопыт напрацаваны падчас будаўніцтва Аўгустоўскага канала. Гэта дасць магчымасць не мяняць фасадны выгляд будынка, ён захаваецца такі, як і 250 гадоў таму. А ў падвале размесціцца буфет. Будынак будзе абсталяваны элементамі безбар'ернага асяроддзя — пад'ёмнікам і ліфтам. Рэканструкцыя разлічана да лютага 2021 года. А вось веламаршрут будзе адкрыты значна раней. Плануецца, што першы заезд адбудзецца летам наступнага года падчас Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

— Да гэтага часу мы закупім ровары. Гэта і звычайныя двухколавыя, і тандэмы, і электраровары, і нават аднаколавы, — расказвае Сяргей Каляда. — Не ведаю, хто на ім паедзе, але ідэя такая ёсць. Першы прабег мяркуем зрабіць тэатралізаваным, а на тандэм пасадзіць «караля» і «каралеву». Адпаведныя касцюмы той эпохі таксама закупім. У будучыні мяркуем арганізоўваць такія прабегі сумесна з польскім бокам.

Сама ідэя стварэння незвычайнага маршруту таксама невыпадковая. Будынак, дзе раней размяшчаўся дзяржаўны гістарычны архіў, пяць гадоў таму пераехаў у іншае месца. Дом гродзенскага старосты пастаяў. Між тым гродзенцы мелі намер даць яму другое жыццё. Такім чынам і з'явілася ідэя сумеснага праекта, накіраванага на «ажыўленне» былой эпохі і ўзнаўленне славутага каралеўскага шляху з Вільні да Кракава.

Ёсць меркаванне, што ў гэтых дамах Тызенгаўз не жыў, а толькі прымаў падчас вандроўкі шляхетных асоб, у тым ліку і каралеўскіх. Цяпер гістарычныя будынкі звяжа веласіпедны маршрут. Дарэчы, польскі бок робіць у сябе інфармацыйны турыстычны цэнтр і майстэрні мастакоў і рамеснікаў. Там будынак крыху меншы, чым у Гродне.

На думку кіраўніка праекта, новая турыстычная «фішка» — яшчэ адзін крок да прыцягвання турыстычнага патоку, у тым ліку бязвізавага. Тут усё накіравана на тое, каб можна было цікава бавіць час не толькі ў сезон, але і круглы год.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 27 декабря 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность

№ лота	1	2	3	4	5	6
Адрес земельного участка	Речицкий р-н, Озерщинский с/с, д. Борхов, 21	Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Грановка, ул. Совхозная, 6А	Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Береговая Слобода, 3	Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Милоград, ул. Садовая, 15А	Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Горваль, ул. Речицкая, 49	Речицкий р-н, Глыбовский с/с, д. Горваль, ул. Бобруйская, 2
Кадастровый номер	324587000601000034	324581602601000120	324582400601000118	324582403601000293	324582402101000230	324582402101000196
Категории земель	Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов					
Площадь, га	0,2366	0,1500	0,2024	0,1341	0,2500	0,2489
Целевое назначение земельного участка	для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме))					для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объекта усадебной застройки (строительства и обслу-живания жилого дома) с объектами обслуживания)
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	возможность подключения электроснабжения	возможность подключения электроснабжения	возможность подключения водо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи	имеется возможность подключения электроснабжения
Начальная цена земельного участка, руб.	1940,12	2220,00	2157,59	2342,99	2368,88	1592,96
Размер задатка, руб.	194,01	222,00	215,8	234,30	236,89	159,30
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1994,26 + публикация в газетах	1760,73 + публикация в газетах	1772,04 + публикация в газетах	1656,72 + публикация в газетах	1888,37 + публикация в газетах	1222,74 + публикация в газетах
Условия аукциона	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений); участок с объектами, подлежащими сносу	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений)	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу	-	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу	-
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка в связи с его расположением:	на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем) на площади 0,2366 га; в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры: на площади 0,0002 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Днепр) на всей площади земельного участка	-	на природной территории, подлежащей специальной охране и в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры: в водоохранной зоне реки Днепр на площади 0,1341 га, в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0045 га, в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения на площади 0,0045 га, в охранных зонах объектов газораспределительной системы на площади 0,0045 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона р. Березина) на всей площади земельного участка	на природной территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона реки Березина) на площади 0,2489 га

Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность

№ лота	7	8	9	10	11
Адрес земельного участка	Речицкий р-н, Белобо-лотский с/с, д. Черное, ул. Восточная, 35А	Речицкий р-н, Белоболотский с/с, д. Глушец, ул. Приозерная, 75	Речицкий р-н, Белоболот-ский с/с, д. Черное, ул. Октябрьская, 35	Речицкий р-н, Белоболот-ский с/с, д. Черное, ул. Октябрьская, 16	Речицкий р-н, Белоболотский с/с, д. Черное, ул. Октябрьская, 1Б
Кадастровый номер	324588605601000150	324588601601000067	324588605601000148	324588605601000147	324588605601000151
Категории земель	Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов				
Площадь, га	0,2500	0,2000	0,2500	0,2500	0,2058
Целевое назначение земельного участка	для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме))				
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи
Начальная цена земельного участка, руб.	3025,00	1600,0	2750,00	2750,00	2263,80
Размер задатка, руб.	302,50	160,0	275,00	275,00	226,38
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1831,22 + публикация в газетах	1690,74 + публикация в газетах	1643,77 + публикация в газетах	1831,06 + публикация в газетах	1694,70 + публикация в газетах
Условия аукциона	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений) и сноса фундамента за счет средств победителя (единственного участника) аукциона	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности (насаждений), с объектами, подлежащими сносу	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности (насаждений)
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка в связи с его расположением:	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона р. Днепр) на площади 0,2500 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона р. Днепр) на площади 0,2000 га; в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт) на площади 0,0398 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Днепр) на площади 0,2500 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона р. Днепр) на площади 0,2500 га	на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона реки Днепр) на площади 0,2058га; в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт) на площади 0,0017 га

Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность

№ лота	12	13	14	15	16	17
Адрес земельного участка	Речицкий р-н, Заспен-ский с/с, д. Луначарск, ул. Набережная, 16	Речицкий р-н, Заспен-ский с/с, д. Луначарск, ул. Набережная, 17А	г. Речица, пер. Кирпичный, 3	г. Речица, ул. Героев Бреста, 68	г. Речица, пер. Ягодный, 9	г. Речица, ул. Николая Сурначева, 11
Кадастровый номер	324584203601000083	324584203601000084	324550100001013489	324550100001013456	324550100001014948	324550100001014949
Категории земель	Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов					
Площадь, га	0,1440	0,1290	0,0708	0,1003	0,0891	0,1035
Целевое назначение земельного участка	для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме))					
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, канализации, сети связи
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии)	-	-	-	-	электрические сети напряжением до 1000 вольт, санитарно-защитные полосы водоводов	электрические сети напряжением до 1000 вольт
Начальная цена, руб.	1267,20	1135,20	3603,72	6860,52	6094,44	7134,12
Размер задатка, руб.	126,72	113,52	360,37	686,05	609,44	713,41
Ориентировочная сумма затрат на организацию и про ведение аукциона, руб.	1470,29 + публикация в газетах	1465,40 + публикация в газетах	1681,76 + публикация в газетах	1791,30 + публикация в газетах	1685,33 + публикация в газетах	1720,02 + публикация в газетах
Условия аукциона	-	-	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности; с объектами, подлежащими сносу	-	-	-
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка в связи с его расположением	на территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона р. Днепр); на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), – на площади 0,1440 га	на природной территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона р. Днепр); на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), – на площади 0,1290 га	в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры, на площади 0,0041 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения	в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры, на площади 0,0062 га – охранная зона объектов газораспределительной системы	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (электрических сетей, санитарно-защитных зонах водоводов), на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС (зона проживания с периодическим радиационным контролем)	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (электрических сетей), на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС (зона проживания с периодическим радиационным контролем)

Аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	18	19	20	21	22
Адрес земельного участка	г. Речица, пр-д Коммунальный	г. Речица, пр-д Коммунальный	г. Речица, ул. Энергетиков, 7А	г. Речица, ул. Фрунзе	Речицкий р-н, в районе реки Ведрич по трассе Речица-Светлогорск
Кадастровый номер	3245501000010146 51	3245501000010146 52	3245501000010133 68	3245501000010133 72	3245000000010155 01
Категории земель	Земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения				
Площадь, га	1,1830	0,8637	0,0424	0,2209	0,2600
Целевое назначение земельного участка	для строительства и обслуживания производственных зданий и сооружений (для размещения объектов неустановленного назначения) по проезду Коммунальному в г. Речице	для строительства и обслуживания автосервиса (СТО) (для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе и автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) по проезду Коммунальному в г. Речице	для строительства и обслуживания административно-торгового объекта (для размещения объектов розничной торговли)	для строительства и обслуживания кафе (для размещения объектов общественного питания)	для строительства и обслуживания объекта многофункционального назначения (объект придорожного сервиса)
Срок аренды, лет	25	25	25	25	25
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи и канализации	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи и канализации	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи и канализации	возможность подключения электроснабжения, сети связи
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии)	ВЛ напряжением 10 кВ	ВЛ напряжением 10 кВ	кабель электроснабжения и сети водоснабжения	сети дождевой канализации	сети ЛЭП, сети связи
Начальная цена, руб.	64 885,31	47 372,30	4192,39	27686,63	1589,61
Размер задатка, руб.	6488,53	4 737,23	419,24	2768,66	158,96
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1977,83 + публикация в газетах	1893,94 + публикация в газетах	1463,66 + публикация в газетах	2232,37 + публикация в газетах	2716,43 + публикация в газетах

Условия аукциона	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений)	с правом удаления древесно-кустарниковой растительности (насаждений)	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности и отдельно стоящих деревьев	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка в связи с его расположением	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры – охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), – на площади 0,0184 га	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры: на площади 0,0234 га – охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, на площади 0,0305 га – в санитарно-защитных полосах водоводов, на площади 0,8637 га – на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем)	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры: на площади 0,0258 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; на площади 0,0258 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения	в охранной зоне объекта инженерной инфраструктуры, на площади 0,0183 га – охранная зона сетей и сооружений канализации	на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Ведрич, в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, охранная зона линий связи и радиофикации, в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги) на всей площади земельного участка

Аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	23	24	25	26
Адрес земельного участка	г. Речица, ул. Молодежная	г. Речица, ул. Светлогорское шоссе	г. Речица, ул. Трифонова	Речицкий р-н, Озерщинский с/с, д. Озерщина, по ул. Набережной
Кадастровый номер	324550100001013370	324550100001014425	324550100001013192	324587001101001599
Категории земель	Земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения	Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов		
Площадь, га	0,2256	0,0911	0,4242	0,0035
Целевое назначение земельного участка	для строительства и обслуживания кафе (для размещения объектов общественного питания)	для строительства и обслуживания торгового объекта (для размещения объектов розничной торговли)	для строительства и обслуживания торгового объекта (для размещения объектов розничной торговли)	для установки и обслуживания торгового павильона с остановочным пунктом(для размещения объектов розничной торговли)
Срок аренды, лет	25	25	25	5
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	возможность подключения водо-, тепло-, электроснабжения, сети связи, сети канализации	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи	возможность подключения водо-, газо-, электроснабжения, сети связи
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии)	сети ливневой канализации	сети связи (подлежат выносу из-под пятна застройки)	линия ЛЭП, сети водо-, газоснабжения, сети связи, кабель высокого напряжения (подлежит выносу)	-
Начальная цена, руб.	22306,65	12176,71	54 344,87	48,40
Размер задатка, руб.	2230,67	1217,67	5 434,49	4,84
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1626,95 + публикация в газетах	1884,63 + публикация в газетах	1974,22 + публикация в газетах	1825,23 + публикация в газетах
Условия аукциона	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности	-	с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности; с условием выноса кабеля высокого напряжения за пределы пятна застройки	с объектом, подлежащим сносу
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка в связи с его расположением	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона сетей и сооружений канализации) на площади 0,0338 га	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры: на площади 0,0326 га – охранная зона линий связи и радиофикации; на площади 0,0214 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; на площади 0,0214 га – охранная зона газораспределительной системы; на площади 0,0911 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона пруда)	в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры: на площади 0,0148 га – охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1 000 вольт; на площади 0,0322 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; на площади 0,0274 га – охранная зона объектов газораспределительной системы; 0,0246 га – охранная зона линий связи и радиофикации. На площади 0,4242 га – природная территория, подлежащей специальной охране (водоохранная зона реки Днепр)	на природной территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона реки Днепр), на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС (зона проживания с периодическим радиационным контролем)

I. Аукцион состоится 27 декабря 2019 года в 15.00 по адресу: г. Речица, пл. Октября, 6.
В случае если аукцион по продаже земельных участков в частную собственность (**по лотам №№ 1–17)** и на право заключения договоров аренды земельных участков (**по лотам №№ 12–16**) признан несостоявшимся (заявление на участие в нем подано только одним гражданином, индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом), земельный участок предоставляется ему в частную собственность (**по лотам №№ 1–17),** в аренду (**по лотам №№ 18–26**) при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены, увеличенной на 5 процентов.
II. Для участия в аукционе подаются и представляются:
* заявление об участии в аукционе;
* документ с отметкой банка, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков) на счет организатора аукциона:**
- р/с № BY63AKBB36044270044763000000, ЦБУ № 323 филиала № 300 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Речица, получатель платежа – Речицкий райисполком, УНП 400001745, БИК AKBBBY21300;
* гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
* индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования (**по лотам №№ 18–26**);
* представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
* представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (**по лотам №№ 18–26**);
* представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык (**по лотам №№ 18–26**);
* представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык (**по лотам №№ 18–26**);
* консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.
Для участия в аукционе граждане, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подает заявление на участие, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, а также заключает с Речицким райисполкомом соглашение.
Граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.
III. Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:
1. После окончания аукциона подписать протокол о результатах аукциона;
2. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона:
по лотам №№ 14–17
* внести плату за земельный участок в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность **на счет районного бюджета** BY60AKBB36004270000050000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск БИК AKBBBY2X, УНП 400555165, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам»;
по лотам №№ 7–11
* внести плату за земельный участок в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность **на расчетный счет Белоболотского сельисполкома** BY72AKBB36004270400070000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 4004000907, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам»;
по лоту № 2
* внести плату за земельный участок в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность **на расчетный счет Борщевского сельисполкома** BY58AKBB36004270300040000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 400555165, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам»;
по лотам №№ 3–6:
* внести плату за земельный участок в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность **на расчетный счет Глыбовского сельисполкома** BY70AKBB36004270700060000000 БИК AKBBBY2X, ЦБУ № 323 филиал 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 40045393, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам»;
по лоту № 1
* внести плату за продажу земельного участка в частную собственность **на расчетный счет Озерщинского сельисполкома** BY32AKBB36004271800130000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск МФО AKBBBY2X, УНП 400555165, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам» в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность;
по лотам №№ 12–13:
* внести плату за земельный участок в сумме, определенной в ходе аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность **на расчетный счет Заспенского сельисполкома** BY22AKBB36004271100120000000, БИК AKBBBY2X, ЦБУ № 323 филиал 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 400555165, код назначения платежа 04901 «Доходы от продажи земельных участков в частную собственность гражданам»;
по лотам №№ 18–26:
* внести плату за право заключения договоров аренды земельных участков в сумме, определенной в ходе аукционных торгов за право аренды земельных участков, **на расчетный счет районного бюджета** BY60AKBB36004270000050000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск код банка AKBBBY2X, УНП 400555165, код назначения платежа 04002 «Плата за право заключения договоров аренды земельных участков»;
* **возместить затраты на организацию и проведение аукциона,** включая расходы, связанные с изготовлением и представлением участниками документации, необходимой для его проведения:
по лотам №№ 1, 2, 6, 12–26 в районный бюджет на расчетный счет BY60AKBB36004270000050000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск БИК AKBBBY2X, УНП 400555165, код назначения платежа 04616 «Доходы, поступившие в возмещение расходов, связанных с организацией (подготовкой) и проведением аукционов и конкурсов по продаже имущества, аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, отводом и государственной регистрацией создания земельных участков»;
по лотам №№ 3–5
на расчетный счет Глыбовского сельисполкома BY70AKBB36004270700060000000 БИК AKBBBY2X, ЦБУ № 323 филиал 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 40045393, код назначения платежа 04616 «Доходы, поступившие в возмещение расходов, связанных с организацией (подготовкой) и проведением аукционов и конкурсов по продаже имущества, аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, отводом и государственной регистрацией создания земельных участков»;
по лоту № 7–11
на расчетный счет Белоболотского сельисполкома BY72AKBB36004270400070000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 4004000907, код назначения платежа 04616 «Доходы, поступившие в возмещение расходов, связанных с организацией (подготовкой) и проведением аукционов и конкурсов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, отводом и государственной регистрацией создания земельных участков».
Затраты на публикацию извещения о проведении аукциона подлежат возмещению в районный бюджет.
3. Не позднее 2 рабочих дней со дня внесения платы за земельные участки, приобретенные в частную собственность (**по лотам №№ 1–17**), за право заключения договоров аренды земельных участков (**по лотам №№ 18–26**) и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, обратиться в Борщевский сельисполком (**по лоту № 2),** в Глыбовский сельисполком (**по лотам №№ 3–6),** в Озерщинский сельисполком **(по лоту № 1)**, в Заспенский сельисполком **(по лотам №№ 12–13),** в Белоболотский сельисполком **(по лотам № 7–11)**, в Речицкий райисполком (**по лотам №№ 14–17**) для получения выписки из решения об изъятии земельного участка и за заключением договоров аренды земельных участков (**по лотам №№ 18–26**).
4. **По земельным участкам, выставляемым на торги для продажи в частную собственность:**
- в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах проведения аукциона по продаже земельных участков в частную собственность либо после признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться в Речицкий филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него. В случае невыполнения данного требования решение о предоставлении земельного участка считается утратившим силу **(по лотам №№ 1–17);**
- в течение двух месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в установленном порядке обратиться за разработкой проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома **(по лотам №№ 1–17)** на предоставленном земельном участке (**по лоту №№1–3, 5, 7–14)** с объектами, подлежащими сносу (**по лотам №№ 1, 3, 5, 7, 9, 10, 14**);
- в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) (**по лотам №№ 1–3, 5–13**);
- гражданин (победитель аукциона продажи (единственный участник несостоявшегося аукциона продажи)) в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) (**по лоту № 4**);
- негосударственное юридическое лицо Республики Беларусь в течение шести месяцев, а гражданин в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) (**по лоту №№ 14–17);**
- осуществить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные проектной документацией **(по лотам №№ 1–17);**
- обеспечить снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно проектной документации (**по лотам №№ 1–3, 5, 12–17);** согласно архитектурному проекту **(по лоту № 6)**; для благоустройства земельного участка **(по лоту № 4);** из-под пятен застройки для благоустройства земельного участка **(по лотам №№ 7–11)**.
5. **По земельным участкам, право аренды которых выставляется на аукционные торги:**
- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах проведения аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков либо после признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться в Речицкий филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него. В случае невыполнения данного требования решение о предоставлении земельного участка считается утратившим силу (**по лотам №№ 18–26**);
- до осуществления государственной регистрации земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него возместить КУП «Речицкий райжилкомхоз» **убытки в сумме 918,75** рубля, причиненные изъятием части земельного участка с кадастровым номером 3245501001008706 (**по лоту № 21);**
- в течение двух месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в установленном порядке обратиться за разработкой проектной документации на строительство объекта (**по лотам №№ 18–26);**
- юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта, приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) **(по лотам №№ 18–26),**
- осуществить строительство объекта на условиях и в сроки, определенные проектной документацией **(по лотам №№ 18, 19, 24);**
- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией **(по лотам №№ 20–23, 25, 26);**
- обеспечить снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно: проектной документации (**по лотам №№ 18–24, 26);** строительному проекту **(по лоту № 25);**
- по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в Речицкий райисполком для внесения сведений об изменении вида земель в государственный земельный кадастр (**по лотам №№ 20, 23**);
- до истечения срока аренды земельного участка, но не позднее двадцати пяти лет (**по лотам №№ 18–26)** и 5 лет **(по лоту № 26)** обеспечить возврат арендуемого земельного участка прежнему землепользователю в состоянии, пригодном для использования в прежних видах земель, или в установленном порядке обратиться за продлением срока аренды земельного участка. Порядок проведения аукционных торгов определяется постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 462 от 26.03.2008 г.
Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Осмотр на местности земельных участков – по мере поступления обращений.
Прием заявлений на участие в аукционе с необходимыми документами осуществляется по адресу: Гомельская область, г. Речица, пл. Октября, 6, Речицкий райисполком, каб. 2-5, 1-9 **с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням** и **заканчивается 24 декабря 2019 г. в 10.00.** Контактные телефоны: (8 02340) **2 31 70, 2 34 61.**

НАВІГАТАР

Тэхналогіі

Чалавека ўпершыню пагрузілі ў анабіёз

Зрабілі гэта амерыканскія навукоўцы, піша партал gazeta.ru. Яны астудзілі цела цяжкапараненага пацыента, запампаваўшы ў крывяносную сістэму солевы раствор. Больш падрабязныя вынікі будуць апублікаваныя пасля серыі падобных эксперыментаў. Даследчыкі разлічваюць, што такі метад дазволіць выйграць час для выратавання людзей са смяротнымі раненнямі.

naked-science.ru

Навукоўцы з Мэрылендскага ўніверсітэта ў Балтыморы ўпершыню змаглі пагрузіць чалавека ў анабіёз. Пра поспехі кіраўнік праекта Сэмюэль Цішарман расказаў на сімпозіуме Нью-Ёркскай акадэміі навук.

Анабіёз — часовае запаволенне або спыненне жыццёвых працэсаў у арганізме пад уздзеяннем знешніх ці ўнутраных фактараў. Да яго здольныя многія расліны і жывёлы, акрамя таго, штучна ў анабіёз можна змясціць чалавечыя эмбрыёны. Аднак увядзенне ў анабіёз даросламу чалавека да гэтага часу не было рэалізавана.

Вынікі першых даследаванняў у гэтай галіне з'явіліся ў 1990-х гадах. Навукоўцы змяшчалі жывёл у анабіёз, астуджаючы іх целы і замяняючы кроў солевым растворам. У іх атрымалася дамагчыся пэўных вынікаў, у тым ліку і на буйных жывёлах — свінях і сабаках. Даследаванні паказалі, што свіней з цяжкімі траўмамі можна трымаць у анабіёзе да трох гадзін. Поспехі ў эксперыментах дазволілі казаць пра магчымасць змяшчэння ў анабіёз і людзей.

Да даследаванняў у гэтай галіне Цішармана падштурхнуў выпадак з пачатку яго кар'еры: маладыя людзі пабіліся ў боўлінгу, і адзін з іх, здаровы юнак, загінуў ад удару нажом у сэрца. Менавіта пасля гэтага даследчык пачаў шукаць спосабы, якія далі б урачам больш часу на выратаванне жыцця пацыента.

Пры нармальнай тэмпературы клеткам чалавечага арганізма неабходна пастаяннае забеспячэнне кіслародам. Пасля спынення сэрца мозг здольны пратрымацца толькі пяць хвілін — затым пачынаюцца незваротныя змены. Аднак паніжэнне тэмпературы цела запавольвае клетачныя працэсы, і кіслароду патрабуецца менш.

Пры ўвядзенні чалавека ў анабіёз яго цела астуджаецца да 10 градусаў. Солевы раствор запампоўваецца ў аорту. Выжывальнасць людзей, якія становяцца ахвярамі нажавых раненняў або перастрэлак, не перавышае 5 %, але такая «кансервацыя» можа павысіць іх шанцы.

У 2014 годзе быў распрацаваны рэгламент эксперыментаў над людзьмі. Выпрабаванні на людзях дазваляліся толькі ў тым выпадку, калі пацыент паўналетні, у яго ёсць пранікальнае раненне, на працягу пяці хвілін пасля прыбыцця ў бальніцу ў яго спыняецца сэрца і ён не рэагуе на рэанімацыйныя мерапрыемствы. Прафесар Цішарман стаяў каля вытокаў метаду разам з аўстралійскім анестэзіёлагам Пітэрам Сафарам, які пайшоў з жыцця. У 2014—2016 гадах ён вёў работу ў Пітсбургскім універсітэце, але так і не дачакаўся пацыентаў, прыдатных да даследаванняў. Тады ён перабраўся ў Балтымар, дзе ўзровень гвалтоўных злачынстваў вышэйшы. У 2018 годзе Цішарман заявіў, што ў яго ўжо ёсць пэўныя вынікі і ён абвесціць іх на працягу наступных двух гадоў. І вось нарэшце гэта адбылося.

Паводле слоў Цішармана, праз працэдуру прайшоў як мінімум адзін пацыент. Чалавек, які атрымаў раненні, прабыў у анабіёзе дзве гадзіны. Урачы прааперыравалі яго, а затым зноў запусцілі сэрца. Аднак навуковец не паведамляў, ці выжыў пацыент.

Цішарман падкрэслівае, што яго работа не мае дачынення да змяшчэння людзей у анабіёз для касмічных палётаў. Паўнавартасная гібернацыя ў палёце — вельмі аддаленая перспектыва, замест гэтага ў NASA вывучаюць спосабы ўвядзення астранаўтаў у стан, блізкі да здранцвення, каб запаволіць метабалізм на працяглы перыяд. «Мы ж спрабуем выйграць час для выратавання жыцця», — тлумачыць Цішарман.

Даследчык плануе правесці 10 аперацый са змяшчэннем чалавека ў анабіёз і параўнаць з 10 выпадкамі, калі людзей з аналагічнымі траўмамі ратавалі без гэтай працэдуры. Падрабязных вынікаў варта чакаць не раней за канец 2020 года.

Пакуль не ясна, колькі часу можна трымаць чалавека ў такім пачатковым анабіёзе. Пры выхадзе з яго ў клетках адбываецца шэраг хімічных рэакцый, якія прыводзяць да пашкоджанняў, і чым даўжэй клеткі застаюцца без кіслароду, тым пашкоджанняў больш. Іх можна кампенсаваць медыкаментозна, але для гэтага трэба сапраўды зразумець усе іх прычыны.

«Увядзенне ў анабіёз — гэта спроба выратаваць пацыента, які памірае, рэзка панізіўшы тэмпературу яго цела і прымусіўшы яго арганізм працаваць павольней. Бываюць сітуацыі, калі на выратаванне жыцця застаецца некалькі секундаў, але іх можна расцягнуць на хвіліны, — каментуе даклад анестэзіёлаг Кевін Фонг. — Кардыяхірургі робяць нешта вельмі падобнае на працягу дзесяцігоддзяў, цяпер жа гаворка ідзе аб прасоўванні гэтай тэхнікі далей, у аддзяленні неадкладнай дапамогі ці, можа быць, нават у палявыя ўмовы. У неадкладнай медыцыне мы заўсёды спрабуем размыць мяжу паміж жыццём і смерцю, здабыць надзею там, дзе яе раней не было. Калі задумка Цішармана спрацуе, гэта зменіць правілы гульні».

Спытайце пра радзіннае

ЯК ШАНАВАЛІ ІКОНЫ?

«Сёння ў гарадскіх кватэрах можна сустрэць іконы, якія мацуюцца на сценах у пакоях, над уваходнымі дзвярамі... Але сучаснік мала што ведае пра правілы карыстання імі, якія існавалі калісьці ў народнай традыцыі. Хацелася б праз вашу рубрыку даведацца», — піша Вольга К. з Маларыты.

Ікона — знак яднання сям'і з Богам — заняла галоўнае месца ў сялянскай хаце: на покуці. Існавала ўяўленне, што ікона здольная асвячаць сваёй прысутнасцю прастору хаты. Таму яе ў ліку іншых сакральных прадметаў на ўлазінах уносілі ў новую хату першай. Лічылася, што не мы глядзім на ікону, а яна вачамі Багародзіцы, Ісуса Хрыста або святога глядзіць на нас і благаслаўляе нас і наша жыццё.

У адносінах да святога абраза выконвалі спецыяльныя рытуальныя дзеянні, напоўненыя высокай ступенню сакральнасці. Перад ім запальвалі свечкі, чыталі малітвы і прагаворвалі клятвы, давалі аброкі, «цвёрда верачы ў выкананне сваёй малітвы», ведаючы: «Хто не па праўдзе прысягае, таго Бог на гэтым свеце карае: ён сам часта хварэе, у жывіны і ў гаспадарцы ўвесь час прыпадкі, і так усё не вядзецца, аж да трэцяга пакалення».

«Скінь шапку, Бог у хаце», — у адносінах да хатняй святыні з цягам часу былі сфарміраваны правілы, якія трэба было няўхільна выконваць. Да іконы забаранялася дакранацца «нячыстаму» чалавеку, напрыклад, жанчыне ў перыяд месячных, мужчыну, які не выконваў забароны на шлюбныя адносіны падчас паста. У прысутнасці іконы забаранялася лаяцца, гаварыць дрэнныя словы. Ваду, якой абмывалі ікону перад святамі, напрыклад, у Чысты чацвер, вылівалі пад чырвоны кут.

Састарэлыя абразы забаранялася спальваць або выкідваць. Іх закопвалі на могілках або пускалі па вадзе. На думку старых людзей, абразоў нельга прадаваць: «Абразы не «купляюцца», а «выменьваюцца» (хоць бы за грошы)», — іх трэба дарыць.

Лічылася, што за крадзеж, спальванне абраза, выкарыстоўванне яго як звычайнай дошкі для побытавых патрэб чалавек будзе пакараны невылечнымі хваробамі. Плюнуць на ікону, зламаць, рассекчы, спаліць — гэтыя дзеянні лічыліся смяротным грахом, за які будзе адплачваць і той, хто такое зрабіў, і не адно пакаленне яго родных.

Ва ўсходніх славян ікона нароўні з такімі сакральнымі прадметамі, як святая вада, свечка, шырока выкарыстоўвалася ў ахоўных і ачышчальных рытуальных дзеяннях. На Беларусі існаваў абрад: калі сын ішоў у рэкруты (служыць у войска), маці падчас провадаў непрыметна, нябачна для ўсіх пераварочвала адзін з абразоў на бажніцы ў чырвоным куце абліччам да сцяны. Такія дзеянні здзяйснялі з адной мэтай: каб салдат вярнуўся дахаты і сам перавярнуў абраз тварам да сябе.

Імкнуліся, каб у кожнага члена сям'і была свая — імянная — ікона з выявай святога, якога лічылі заступнікам чалавека, што насіў яго імя. З іконай у варотах сустракалі набытую скаціну і благаслаўлялі, першы раз выганяючы жывёлу ўвесну на пашу.

Цяпер амаль ва ўсіх аўтамабілях можна ўбачыць прымацаваную каля руля так званую «падарожную» ікону. Такім чынам пацвярджаецца мудрая, шмат у чым прагматычная філасофія абачлівага беларуса, сфармуляваная ў кароткай прыказцы: «Без Бога — не да парога».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Знаходкі

Залаты пратэз з XIX стагоддзя

Брытанец Пітэр Крос у вольны час займаецца пошукамі скарбаў. Гэтаму хобі 59-гадовы муляр прысвяціў чатыры дзясяткі гадоў, але найбольш значную знаходку зрабіў цяпер. Спачатку ён не зразумеў, што апынулася ў яго руках: выняты з зямлі брудны прадмет нагадваў авечыя зубы. Але пасля ачысткі мужчына ўбачыў залатыя пласціны і зразумеў, што перад ім — верхняя частка чалавечай устаўной сківіцы.

Ён паказаў яе розным спецыялістам — ад стаматолагаў да навукоўцаў. Эксперты датуюць знаходку 1800—1850 гадамі. Зубы вытачаны з косці бегемота ці маржа, кожны мае ўнікальны рэльеф і вельмі дакладна падагнаны пад аснову. Для большага падабенства нават для дзёснаў падабраныя косткі цямнейшага колеру — гэта вельмі тонкая ручная работа. Зубы змацаваныя металічнымі штыфтамі, што і дазволіла знайсці прадмет з дапамогай металашукальніка. Пазней Пітэр спрабаваў адшукаць ніжнюю частку пратэза, але, магчыма, у ёй не было металічных дэталяў, таму пошукі поспехам не ўвянчаліся. На заднім баку пласціны знаходзяцца літары і лічбы WSF і N 435, але супаставіць іх з нейкай гістарычнай інфармацыяй пакуль не атрымалася. Бясспрэчна толькі тое, што штучныя зубы належалі вельмі багатаму чалавеку: пратэз з золата і косці абышоўся б у «цэлы маёнтак». Паводле папярэдніх ацэнак, тады такая сківіца магла каштаваць ад 200 да 300 фунтаў, і на гэтыя грошы можна было купіць палову дамоў у невялікім населеным пункце.

Нягледзячы на якасць (рэвалюцыйную для свайго часу), насіць гэтыя пратэзы пастаянна было вельмі некамфортна, і людзі надзявалі іх толькі падчас яды ці, можа, на важныя перамовы. А затым уладальнік каштоўнай сківіцы мог проста ўпусціць яе з кішэні. За такую незвычайную і цікавую знаходку скарбашукальнік будзе ўзнагароджаны. Літаральна днямі сківіца будзе выстаўлена на аўкцыёне; эксперты ацэньваюць яе ў суму ад 3 да 7 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Атрыманыя грошы будуць падзеленыя паміж Кросам і яго калегам Даянай Уайлд, якая прысутнічала пры раскопках, — яны атрымаюць па 25 %, а астатняе дастанецца ўладальніку зямлі, дзе быў знойдзены артэфакт.

Са свайго боку, спецыялісты лічаць, што знаходка павінна быць адпраўлена ў музей. Сучаснай навуцы вядомы толькі адзін падобны набор устаўных зубоў. Ён адносіцца да канца XVIII стагоддзя, і яго ўладальнікам быў амерыканскі прэзідэнт Джордж Вашынгтон.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Дарагога мужа, бацечку і дзядулю
Радзівона Іларыёнавіча ШПЕЦА
шчыра віншуем з прыгожым юбілеем, з дзевяностагоддзем!
Зычым табе, наш родны, каб ніколі не падводзіла здароўе, каб, зноў жа, ніколі не перасыхалі крынічкі твайго жыццялюбства і аптымізму, каб тваё атачэнне заўсёды радавала цябе сваёй увагай і клопатам, каб толькі светлыя эмоцыі дарыў кожны пражыты дзень!
З любоўю і ўдзячнасцю за ўсё, што ты зрабіў і робіш для нас, твая сям'я: жонка, дзеці, унукі і праўнукі.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ПАЧАСТУНАК ДЛЯ АРХІДЭІ

Шматлікія аматары архідэй ведаюць, што кветка, якая нармальна развіваецца, часта тармозіць сваё цвіценне. У чым жа справа і як гэта можна выправіць?

У прыродзе архідэя атрымлівае ўсе неабходныя рэчывы з дажджавой вадой. Дома мы не можам стварыць для кветкі ўмовы, якія будуць цалкам адпавядаць прыродным. Але ёсць адна хітрасць, дзякуючы якой можна дапамагчы архідэі і прымусіць яе багата цвісці.

Гэтая хітрасць не прыносіць расліне ніякай шкоды, а толькі ўзнаўляе прыродныя ўмовы для цвіцення. Гаворка ідзе пра часночны «пачастунак». Ён паляпшае агульны стан каранёвай сістэмы і знішчае шкодныя для кветкі бактэрыі.

Для прыгатавання неабходна пяць буйных зубчыкаў часнаку або шэсць-сем невялікіх, два кубкі ці крыху больш вады, палова таблеткі бурштынавай кіслаты. Трэба растварыць кіслату ў гарачай вадзе, выціснуць туды ж часночны сок і ў шкляной ёмістасці даць настояцца суткі.

Як правільна паліваць такім настоем архідэі? Ставім вазон з архідэяй у шырокую ёмістасць з вадой, каб ён быў амаль цалкам пакрыты вадкасцю, туды дадаём нашу часночную падкормку. Так пакідаем на пару гадзін. Затым дастаём гаршчок з архідэяй і ставім на звычайнае месца. І ўжо праз месяц любуемся багатым цвіценнем.

Настоем, які застанецца, можна паліць іншыя пакаёвыя расліны. Часта паліць такой смакатой архідэі і іншыя кветкі можна не часцей чым раз у тры месяцы.

ЯК ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ЯЕЧНАЕ ШКАРЛУПІННЕ

Абарона ад кратоў. Можна назаўжды пазбавіцца ад гэтых шкоднікаў, калі ў ямку падчас пасадкі пакласці некалькі кавалачкаў сухой яечнай шкарлупіны. Грызуну не спадабаюцца вострыя краі, і ён больш не будзе рыць тут хады.

Абарона ад «чорнай ножкі». Выкарыстоўваючы шкарлупінне, можна абараніць расліны ад загнівання каранёвай часткі. З мэтай прафілактыкі парашком са здробненага шкарлупіння пасыпаюць глебу, дзе высаджаны расліны. З лячэбнай мэтай, калі ўжо частка раслін пашкоджана, іх цалкам вырываюць, а глебу багата пасыпаюць парашком.

Для раскіслення глебы. Калі ёсць вялікія запасы шкарлупіння, то на 1 м² дадаюць 500 грамаў парашку. Калі яго не вельмі шмат, тады перад пасадкай у кожную лунку кладуць адну жменю.

Як угнаенне. Падкормліваюць настоем шкарлупіння любыя расліны з мэтай узбагачэння мікраэлементамі. Выкарыстоўваючы гэта ўгнаенне, можна атрымаць добры ўраджай капусты, караняплодаў, цыбулі, іншай агародніны, слівы і вішні.

Змагацца са слімакамі таксама можна — рассыпце зверху на капусную градку здробненае шкарлупінне і трохі буйных кавалачкаў.

Каб пазбавіцца ад мядзведкі і абараніць расліны, таксама можна ўнесці ў лункі пры пасадцы трохі здробненага парашку яечнага шкарлупіння.

Вельмі любяць «белае покрыва» са здробненага шкарлупіння баклажаны, кавуны і дыні. Неабходна на 1 м² зямлі дадаць па дзве шклянкі парашку.

Калі таматы пачалі чарнець, паспрабуйце ўнесці ў глебу трохі здробненага ўгнаення са шкарлупіння яек. Імгненнага эфекту чакаць не варта, а вось праз некаторы час расліна пачне здаравець.

Яечнае шкарлупіння трэба дадаваць і ў кампоставую кучу, а таксама ў невялікай колькасці ў глебу для расады і для вырошчвання пакаёвых раслін, каб разрыхліць зямлю.

З буйных кавалачкаў шкарлупіння можна атрымаць **добры дрэнаж** для вырошчвання моцнай расады — неабходна на дно кожнай шкляначкі пакласці трохі шкарлупіны, а потым зверху дадаць зямлю. Такі дрэнаж любяць усе расліны без выключэння.

Пакаёвыя кветкі можна паліваць настоем з яечнага шкарлупіння. Для яго прыгатавання трэба шкарлупінне апарыць кіпенем, заліць звычайнай вадой і пакінуць на чатыры дні. Пасля гэтага можна выкарыстоўваць угнаенне для паліву раслін.

Даты | Падзеі | Людзі

27 ЛІСТАПАДА

У краіне

1874 год — нарадзіўся (вёска Моталь Іванаўскага раёна) Хаім Вейцман, палітычны і дзяржаўны дзеяч Ізраіля, навуковец-хімік, прафесар біялогіі. Выкладаў у Жэнеўскім, Манчэстарскім універсітэтах, узначальваў хімічную лабараторыю. У 1918 годзе заснаваў яўрэйскі ўніверсітэт у Іерусаліме. У 1948—1952 гадах першы прэзідэнт Ізраіля. Памёр у 1952 годзе.

1879 год — нарадзіўся Мірон Канстанцінавіч Уладзіміраў, дзяржаўны і партыйны дзеяч. Вёў падпольную барацьбу ў Гомелі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Палескага камітэта РСДРП. З 1905 года вёў рэвалюцыйную работу ў Адэсе, Луганску, Екацярынаславе. У дні Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзначальваў харчовую ўправу Петраграда, у 1919-м — член РВС і старшыня асобай харчовай камісіі Паўднёвага фронту. У 1921-м — наркам харчавання, затым — наркам Украіны. Памёр у 1925 годзе.

1904 год — нарадзіўся Мікалай Пятровіч Звездачотай, акцёр, народны артыст Беларусі (1944). У 1929-м скончыў Ленінградскі тэатральны тэхнікум. Працаваў у Беларускім тэатры імя Якуба Коласа. Акцёр яркага тэмпераменту, унутранай напоўненасці. Сярод роляў — Шадрын («Чалавек са зброяй» Пагодзіна), Алесь («Вайна вайне» Якуба Коласа), Невядомы («Раскіданае гняздо» Янкі Купалы). Памёр у 1985 годзе.

1914 год — нарадзіўся Андрэй Ульянавіч Ульянаў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Маскоўскі завочны інстытут тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага, Пензенскае ваеннае вучылішча. Акцёр тэатраў аперэты ў Кургане, Куйбышаве. З 1941-га ў Чырвонай Арміі, з 1943-га на фронце, капітан. Загінуў у баі ў 1944-м пры вызваленні Століна.

1954 год — нарадзіўся Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) Жыгуноў, беларускі паэт. Працаваў настаўнікам, на радыё, у рэдакцыях газет. Аўтар паэтычных зборнікаў «Мая троіца», «Пагавары са мной пра восень» і іншых.

У свеце

1699 год — выдадзены ўказ Пятра I аб увядзенні рэкруцкай сістэмы набору салдат, які паклаў пачатак стварэнню рэгулярнай расійскай арміі.

1939 год — нарадзілася Галіна Аляксандраўна Польскіх, актрыса, народная артыстка Расіі (1979). Здымалася ў фільмах «Журналіст», «Партрэт з дажджом», «Цені знікаюць апоўдні», «Любіць па-руску» ды іншых. У 1983-м упершыню прыехала ў Мінск для здымак фільма «Белыя росы» на «Беларусьфільме». З Беларуссю ў актрысы даўняя сувязь: рана асірацеўшы, Галіна Польскіх доўгі час жыла ў сваёй бабулі пад Магілёвам.

1953 год — нарадзіўся Барыс Барысавіч Грабеншчыкоў, рускі паэт і музыкант, лідар культавага гурта «Акварыум».

1979 год — на Пленуме ЦК КПСС членам Палітбюро абраны Мікалай Ціханаў, а кандыдатам у члены Палітбюро — 48-гадовы Міхаіл Гарбачоў. У далейшым Ціханаў будзе адным з асноўных праціўнікаў вылучэння Гарбачова на пост Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

2009 год — адбылося крушэнне цягніка «Неўскі экспрэс», які рухаўся з Масквы ў Санкт-Пецярбург, загінула 28 чалавек. Прычынай сходу цягніка з рэек стаў тэракт.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.58	16.56	7.58
Віцебск	8.54	16.39	7.45
Магілёў	8.48	16.46	7.58
Гомель	8.37	16.50	8.13
Гродна	9.12	17.12	8.00
Брэст	9.05	17.20	8.15

Месяц

Маладзік 26 лістапада.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Ганны, Аляксея, Віктара, Пятра, Рыгора, Сяргея.*
К. *Валерыі, Ксеніі, Максіма, Яраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Мой муж кажа, што я не павінна ўсё планаваць так далёка наперад. Праўда, ён мне яшчэ не муж...

— А вы пойдзеце на апошні канцэрт Пугачовай?
— Не, мы летась былі!

Пяць міфічных істот:
1. Цмок.
2. Прышэлец.
3. Адзінарог.
4. Дамавік.
5. Чалавек, які глядзіць на шыльду на дзвярах «Ад сябе» ці «На сябе» і з першага разу правільна адчыняе дзверы.

Каб паказаць, хто ў хаце гаспадар, бацька сямейства насіў бэйджык.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3888.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 лістапада 2019 года.